І. Г. Арэф'ева В. М. Пірутка

АЛГЕБРА

10

$$\operatorname{tg} \alpha = f'(x_0)$$



$$\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}} = \sqrt[kn]{a}$$

$$\sqrt[n]{a^m} = \sqrt[nk]{a^{mk}}$$

І. Г. Арэф'ева В. М. Пірутка

АЛГЕБРА

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск «Народная асвета» 2019

УДК 512(075.3=161.3)
ББК 22.144я721
А89

Пераклад з рускай мовы *Н. М. Алганавай*

Рэцэнзенты:
кафедра вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі механіка-матэматычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры *В. В. Беняш-Крывец*);
настаўнік матэматыкі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» ліцэя Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта *А. Я. Цыбулька*

ISBN 978-985-03-3153-3

Шаноўныя дзесяцікласнікі!

Па гэтай кнізе вы працягнеце вывучэнне алгебры. Кніга складаецца з чатырох раздзелаў, кожны з якіх падзелены на параграфы, дзе вы сустрэнеце наступныя ўмоўныя абазначэнні:

— заданні на паўтарэнне для падрыхтоўкі да вывучэння новага матэрыялу;

— новы тэарэтычны матэрыял і метады яго прымянення;

— алгарытмы;

— важныя правілы і сцверджанні;

— дадатковы матэрыял для паглыблення матэматычных ведаў;

— асноўныя прыклады з рашэннямі і падрабязным апісаннем паслядоўнасці дзеянняў;

— вусныя пытанні і заданні;

— заданні для работы ў класе;

— заданні для дамашняй работы;

— заданні для паўтарэння;

* — заданні павышанай складанасці.

Кожны раздзел вучэбнага дапаможніка заканчваецца рубрыкай «Выніковая самаацэнка», у якой вы знойдзеце пералік патрабаванняў да засваення тэарэтычнага матэрыялу і практычныя заданні для самаправеркі.

Для абагульнення раней вывучанага матэрыялу ў вучэбным дапаможніку дадзены раздзел «Паўтарэнне курса алгебры 7—9-х класаў».

У раздзеле «Матэматыка вакол нас» змешчаны задачы на прымяненне матэматыкі ў розных галінах жыцця.

Для тых, хто вывучае матэматыку на павышаным узроўні, дадатковы тэарэтычны матэрыял і заданні па алгебры размешчаны ў вучэбным дапаможніку «Зборнік задач па алгебры, 10 кл.».

Жадаем поспехаў!

1. Вызначце, якія з пунктаў $A(-5;\ 8)$; $B(5;\ -8)$; $C(-5;\ -8)$; $D(8;\ -5)$; $E(5;\ 8)$ сіметрычныя адносна: а) восі абсцыс; б) восі ардынат; в) пачатку каардынат.

2. Ці праўда, што:

а) $3 \in \boldsymbol{N}$; б) $0 \in \boldsymbol{N}$; в) $-2{,}6 \in \boldsymbol{Z}$; г) $-7 \in \boldsymbol{Z}$; д) $\frac{5}{7} \in \boldsymbol{Q}$;

е) $8{,}(3) \in \boldsymbol{Q}$; ж) $\sqrt{7} \in \boldsymbol{I}$; з) $\pi \in \boldsymbol{I}$; і) $2 \in \boldsymbol{R}$; к) $-\sqrt{13} \in \boldsymbol{R}$?

3. Знайдзіце значэнне выразу $\frac{330 \cdot 10^{-3}}{22 \cdot 10^{2}}$. Вынік запішыце ў стандартным выглядзе.

4. Скараціце дроб $\frac{a^2 - 2a + 1}{a^2 - 7a + 6}$.

5. Рашыце ўраўненне:

а) $\frac{x-4}{3} - \frac{x+1}{2} = 3$; б) $(x-4)^2 - 2x = 7$;

в) $\frac{4}{x^2-9} + \frac{x+1}{x-3} = 1$; г) $9x^4 + 8x^2 - 1 = 0$.

6. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\left(\sqrt{18} - \sqrt{2}\right)^2$; б) $\left(3\sqrt{6} + \sqrt{2}\right)\left(\sqrt{2} - 3\sqrt{6}\right)$; в) $\frac{21\sqrt{20}}{\sqrt{125} - \sqrt{45}}$.

7. Рашыце сукупнасць няроўнасцей $\left[\begin{array}{l} x < 2, \\ 2x - 1 \leqslant 7. \end{array}\right.$

8. Знайдзіце абсяг вызначэння функцыі $y = \sqrt{4x^2 - 5x + 1}$.

9. Метадам інтэрвалаў рашыце няроўнасць $\frac{(x-4)^2(x+5)}{x-1} \leqslant 0$.

10. Рашыце сістэму ўраўненняў $\begin{cases} 2y = x + 2, \\ 2xy = 3. \end{cases}$

11. На рысунку 1 паказаны графік функцыі $y = f(x)$, зададзенай на мностве $[-8;\ 7]$. Знайдзіце:

а) мноства значэнняў функцыі; б) нулі функцыі; в) прамежкі знакапастаянства функцыі; г) прамежкі манатоннасці функцыі; д) значэнне выразу $f(-5) + f(3)$; е) усе карані ўраўнення $f(x) = -2$.



Рыс. 1

12. Запішыце формулу функцыі, графік якой атрымліваецца з графіка функцыі $y = \sqrt{x}$ зрухам яго: а) на 6 адзінак улева ўздоўж восі абсцыс і на 4 адзінкі ўверх уздоўж восі ардынат; б) на 5 адзінак управа ўздоўж восі абсцыс і на 2 адзінкі ўніз уздоўж восі ардынат; в) на 1 адзінку ўлева ўздоўж восі абсцыс; г) на 9 адзінак уверх уздоўж восі ардынат.

13. У адной сістэме каардынат пабудуйце графікі функцый:

$y = -(x+5)^2$; $y = \frac{1}{2}x^2 - 4$; $y = -2(x-6)^2 + 3$; $y = (x-1)^2 + 2$.

Якая з дадзеных функцый з'яўляецца цотнай?

14. Знайдзіце значэнне выразу $\left(\sqrt{3} - 2\right)^2 + \sqrt{\left(6 - 4\sqrt{3}\right)^2}$.

15. Вылічыце: $(0{,}0001)^{-4} \cdot 10^{-15}$.

16. Скараціце дроб $\frac{x^2 - 2x - 8}{x^2 - 16}$.

17. Рашыце ўраўненне:

а) $5(x-1) + 3 = 3x - 4$; б) $\frac{x}{x^2 - 25} + \frac{4 - x}{x - 5} = 0$.

18. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\left(\sqrt{27} + \sqrt{3}\right)^2$; б) $\left(2\sqrt{5} + 1\right)\left(1 - 2\sqrt{5}\right)$.

19. Рашыце няроўнасць:

а) $7x - 1 \leqslant 4(x+2)$; б) $6x^2 - x - 1 > 0$; в) $\frac{(x-2)^2}{(x+3)(x-1)} \leqslant 0$.

20. Знайдзіце абсяг вызначэння функцыі $y = \sqrt{16 - x^2}$.

21. Рашыце сістэму ўраўненняў $\begin{cases} x^2 - y = 15, \\ y - x = 5. \end{cases}$

22. Пабудуйце парабалу $y = -x^2 + 4$ і прамую $y = x - 2$ і знайдзіце каардынаты пунктаў перасячэння гэтых графікаў.

23. Вызначце, рацыянальным ці ірацыянальным лікам з'яўляецца значэнне выразу $\left(3 - \sqrt{2}\right)^2 + \sqrt{\left(8 - 6\sqrt{2}\right)^2}$.

Дадатковыя матэрыялы да вучэбнага дапаможніка «Алгебра, 10» можна знайсці на сайце http://e-vedy.adu.by, курс «Матэматыка. 10 клас».

Раздзел 1

ТРЫГАНАМЕТРЫЯ

§ 1. Адзінкавая акружнасць. Градусная і радыянная мера адвольнага вугла

1.1. Вызначце, якія з дадзеных пунктаў каардынатнай плоскасці знаходзяцца на аднолькавай адлегласці ад пачатку каардынат:

$A(-4;\ 3);\ B(3;\ 4);\ C(4;\ -3);\ D(0{,}75;\ -0{,}4);\ E\left(-\frac{3}{4};\ -\frac{2}{5}\right).$

1.2. Назавіце каардынаты пунктаў, сіметрычных пунктам $A(3;\ 1)$ і $B(-1;\ 5)$ адносна: а) восі ардынат; б) восі абсцыс; в) пачатку каардынат.

На рысунку 2 адлюстраваны ваганні маятніка і паказаны відарыс графіка функцыі, якая апісвае зрушэнне маятніка ад становішча раўнавагі ў залежнасці ад часу. Вывучэнне працэсу вагання маятніка, а таксама многіх іншых працэсаў у фізіцы (механічныя, электрамагнітныя ваганні, хвалі і г. д.) прыводзіць да неабходнасці разглядаць трыганаметрычныя функцыі рэчаіснага аргумента.



Рыс. 2

Для вывучэння трыганаметрычных функцый выкарыстоўваецца паняцце адзінкавай акружнасці.

Адзінкавую акружнасць называюць таксама каардынатнай акружнасцю.

Азначэнне. Акружнасць на каардынатнай плоскасці адзінкавага радыуса з цэнтрам у пачатку каардынат (рыс. 3) называецца **адзінкавай акружнасцю.**



Рыс. 3

Для таго каб задаць каардынатную акружнасць, трэба пазначыць:

- пачатак адліку — пункт $P_0(1;\ 0)$;
- напрамак руху пункта па акружнасці (супраць гадзіннікавай стрэлкі — дадатны, а па гадзіннікавай стрэлцы — адмоўны (рыс. 4)).



Рыс. 4



Рыс. 5

Пункты на акружнасці будзем атрымліваць шляхам павароту пункта $P_0(1; 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на зададзены вугал.

Пункт P_α (рыс. 5) атрыманы паваротам

- пункта $P_0(1; 0)$ (пазначаецца пункт, які паварочваецца)
- вакол пачатку каардынат (пазначаецца цэнтр павароту)
- на вугал α (пазначаецца, на які вугал выконваецца паварот — вугал павароту).

Такім чынам, пры павароце пункта P_0 вакол пачатку каардынат на вугал α у зададзеным напрамку атрымліваецца пункт P_α адзінкавай акружнасці.



Рыс. 6

Прыклад 1. Пабудаваць на адзінкавай акружнасці пункт $P_{120°}$.

Рашэнне. Пункт $P_{120°}$ атрымліваем паваротам **супраць** гадзіннікавай стрэлкі пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 120° (рыс. 6).



Рыс. 7

Прыклад 2. Пабудаваць на адзінкавай акружнасці пункт $P_{-120°}$.

Рашэнне. Пункт $P_{-120°}$ атрымліваем паваротам **па** гадзіннікавай стрэлцы пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 120° (рыс. 7).

Прыклад 3. Пабудаваць на адзінкавай акружнасці пункт:

а) $P_{360°}$; б) $P_{630°}$; в) $P_{990°}$.

Рашэнне. а) Паколькі паварот на 360° адпавядае аднаму поўнаму абароту, то неабходна выканаць паварот пункта $P_0(1; 0)$ супраць гадзіннікавай стрэлкі на 360° (поўны абарот). Пункт $P_{360°}$ супадае з пунктам P_0 (рыс. 8, *а*).



Рыс. 8

б) Паколькі $630° = 360° + 270°$, то неабходна выканаць адзін поўны абарот і яшчэ паварот пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат супраць гадзіннікавай стрэлкі на вугал 270° (рыс. 8, *б*).

в) Паколькі $990° = 2 \cdot 360° + 270°$, то трэба выканаць два поўныя абароты і яшчэ паварот пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат супраць гадзіннікавай стрэлкі на вугал 270° (рыс. 8, *в*).

Прыклад 4. Пабудаваць на адзінкавай акружнасці пункт $P_{-1200°}$.

Рашэнне. $-1200° = -360° \cdot 3 + (-120°)$, таму трэба выканаць тры поўныя абароты і яшчэ паварот пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат па гадзіннікавай стрэлцы на вугал 120° (рыс. 9).



Рыс. 9

Радыяннае вымярэнне вуглоў

Па формуле даўжыні акружнасці $C = 2\pi R$ атрымаем, што даўжыня адзінкавай акружнасці ($R = 1$) роўна 2π.

На адзінкавай акружнасці (рыс. 10) лёгка адзначыць пункты $P_{\frac{\pi}{2}}$; P_{π}; $P_{\frac{3\pi}{2}}$; $P_{2\pi}$, якія адпавядаюць вуглам павароту 90° (чвэрць акружнасці), 180° (палова акружнасці), 270° (тры чвэрці акружнасці), 360° (уся акружнасць).

Лікі $\frac{\pi}{2}$; π; $\frac{3\pi}{2}$; 2π — гэта радыянная мера вуглоў, градусная мера якіх адпаведна роўна 90°, 180°, 270°, 360°.



Рыс. 10

Вугал у 1 радыян (ад лац. *radius* — прамень, радыус) — гэта цэнтральны вугал, які абапіраецца на дугу, даўжыня якой роўна радыусу акружнасці.

На рысунку 11 адзначаны пункт адзінкавай акружнасці, які адпавядае вуглу ў 1 радыян. Даўжыня дугі адзінкавай акружнасці, якая адпавядае вуглу ў 1 радыян, роўна 1.



Рыс. 11

Паколькі 2π радыян адпавядае $360°$, то градусная мера вугла ў 1 радыян роўна:

$$1\text{ рад} = \frac{360°}{2\pi} = \frac{180°}{\pi} \approx 57°.$$

Скарочанае абазначэнне радыяна «рад» часцей за ўсё не пішуць.

$$180° = \pi\text{ рад};$$
$$1° = \frac{\pi}{180}\text{ рад}; \; 1\text{ рад} = \frac{180°}{\pi}$$

Каб выразіць **градусную** меру вугла $n°$ **у радыяннай**, трэба $n°$ памножыць на $\frac{\pi}{180°}$.

Напрыклад,

$$30° = 30° \cdot \frac{\pi}{180°} = \frac{\pi}{6};$$

$$-450° = -450° \cdot \frac{\pi}{180°} = -\frac{5\pi}{2}.$$

$$120° = 120° \cdot \frac{\pi}{180°} = \frac{2\pi}{3}$$
$$-225° = -225° \cdot \frac{\pi}{180°} = -\frac{5\pi}{4}$$

Каб выразіць **радыянную** меру вугла α **у градуснай**, трэба лік α памножыць на $\frac{180°}{\pi}$.

Напрыклад,

$$\frac{\pi}{4} = \frac{\pi}{4} \cdot \frac{180°}{\pi} = 45°;$$

$$2\text{ рад} = 2 \cdot \frac{180°}{\pi} \approx 2 \cdot 57° = 114°.$$

$$-\frac{9\pi}{4} = -\frac{9\pi}{4} \cdot \frac{180°}{\pi} = -405°$$
$$5\text{ рад} = 5 \cdot \frac{180°}{\pi} \approx 5 \cdot 57° = 285°$$

На рысунку 12 паказана адпаведнасць паміж градуснай і радыяннай мерай некаторых вуглоў.



Рыс. 12

Прыклад 5. Пабудаваць на адзінкавай акружнасці пункт $P_{\frac{2\pi}{3}}$.

Рашэнне. Пункт $P_{\frac{2\pi}{3}}$ атрымліваем паваротам супраць гадзіннікавай стрэлкі пункта $P_0(1;\,0)$ вакол пачатку каардынат на вугал $\frac{2\pi}{3} = 120°$ (рыс. 13).



Рыс. 13



Рыс. 14

У залежнасці ад таго, у якую чвэрць каардынатнай плоскасці пападае пункт P_α, гавораць, што ў такой жа чвэрці знаходзіцца вугал α.

Напрыклад, вуглы 53° і 378° знаходзяцца ў першай чвэрці, вуглы 128° і –930° знаходзяцца ў другой чвэрці, вуглы 259° і –140° знаходзяцца ў трэцяй чвэрці, а вугал 337° знаходзіцца ў чацвёртай чвэрці (рыс. 14).

Вуглы 0°; 90°; 180°; 270°; 360°; ... адпавядаюць межам чвэрцяў.

Прыклад 6. Вызначце, у якой чвэрці знаходзіцца вугал 3 рад.

Рашэнне. $3 \text{ рад} \approx 3 \cdot 57° = 171°$. Паколькі $90° < 171° < 180°$ $\left(\frac{\pi}{2} < 3 \text{ рад} < \pi\right)$, то дадзены вугал знаходзіцца ў другой чвэрці.

Прыклады асноўных заданняў і іх рашэнні

1. На адзінкавай акружнасці адзначце пункт, які атрымліваецца паваротам пункта $P_0(1;\,0)$ вакол пачатку каардынат на вугал:

а) 50°; б) –220°; в) –90°; г) 190°.

Рашэнне. а) Пункт $P_{50°}$ атрымліваем паваротам **супраць** гадзіннікавай стрэлкі пункта $P_0(1;\,0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 50° (рыс. 15, *а*).

б) Пункт $P_{-220°}$ атрымліваем паваротам **па** гадзіннікавай стрэлцы пункта $P_0(1;\,0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 220° (гл. рыс. 15, *а*).

в) Пункт $P_{-90°}$ атрымліваем паваротам **па** гадзіннікавай стрэлцы пункта $P_0(1;\,0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 90° (рыс. 15, *б*).



Рыс. 15

г) Пункт $P_{190°}$ атрымліваем паваротам **супраць** гадзіннікавай стрэлкі пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 190° (гл. рыс. 15, *б*).

2. Пакажыце, што пункты:
а) $P_{40°}$ і $P_{400°}$; б) $P_{-10°}$ і $P_{-730°}$ — адзінкавай акружнасці супадаюць.

Рашэнне. а) Паколькі $400° = 360° + 40°$, то, для таго каб атрымаць пункт $P_{400°}$, трэба выканаць адзін поўны абарот і яшчэ паварот пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат супраць гадзіннікавай стрэлкі на вугал 40° (рыс. 16, *а*).

б) $-730° = -360° \cdot 2 + (-10°)$ (рыс. 16, *б*).



Рыс. 16

3. На адзінкавай акружнасці адзначце пункт, які атрымліваецца паваротам пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал:
а) 550°; б) −1300°.



Рыс. 17

Рашэнне. а) Паколькі $550° = 360° + 190°$, то выканаем адзін поўны абарот і яшчэ паварот пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат супраць гадзіннікавай стрэлкі на вугал $190°$ (рыс. 17, *а*).

б) Паколькі $-1300° = -360° \cdot 3 + (-220°)$, то выканаем тры поўныя абароты і яшчэ паварот пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат па гадзіннікавай стрэлцы на вугал $220°$ (рыс. 17, *б*).

4. Запішыце ўсе вуглы α, для якіх пункт P_α супадае з пунктам:

а) $P_{90°}$; б) $P_{-217°}$.

Рашэнне. а) Адзначым на адзінкавай акружнасці пункт $P_{90°}$. Паколькі, напрыклад, $450° = 90° + 360°$, $810° = 90° + 2 \cdot 360°$, $-270° = 90° - 360°$ і да т. п., то пункты адзінкавай акружнасці $P_{450°}$, $P_{810°}$, $P_{-270°}$ супадаюць з пунктам $P_{90°}$ адзінкавай акружнасці. Відавочна, што існуе бясконца многа вуглоў α, для якіх пункты адзінкавай акружнасці P_α і $P_{90°}$ супадаюць. Гэтыя вуглы могуць быць атрыманы ў выніку павароту пункта $P_{90°}$ на цэлы лік поўных абаротаў па або супраць гадзіннікавай стрэлкі (рыс. 18), такім чынам, $\alpha = 90° + 360° \cdot n, n \in \boldsymbol{Z}$.



Рыс. 18

б) $\alpha = -217° + 360° \cdot n, n \in \boldsymbol{Z}$.

5. Выразіце ў радыянах вугал:

а) $150°$; б) $20°$; в) $-80°$; г) $2000°$.

Рашэнне.

а) $150^\circ \cdot \frac{\pi}{180^\circ} = \frac{5\pi}{6}$; б) $20^\circ \cdot \frac{\pi}{180^\circ} = \frac{\pi}{9}$;

в) $80^\circ \quad \frac{\pi}{180^\circ} = -\frac{4\pi}{9}$; г) $2000^\circ \cdot \frac{\pi}{180^\circ} = \frac{100\pi}{9}$.

6. Выразіце ў градусах вугал:

а) $\frac{\pi}{2}$; б) $\frac{\quad}{4}$; в) $\frac{7\pi}{18}$; г) $\frac{4\pi}{3}$; д) 4; е) –3.

Рашэнне.

а) $\frac{\pi}{2} = \frac{\pi}{2} \cdot \frac{180^\circ}{\pi} = 90^\circ$; б) $\frac{\quad}{4} \quad \frac{\quad}{4} \cdot \frac{180}{\quad} \quad 45$;

в) $\frac{7\pi}{18} = \frac{7\pi}{18} \cdot \frac{180^\circ}{\pi} = 70^\circ$; г) $\frac{4\pi}{3} = \frac{4\pi}{3} \cdot \frac{180^\circ}{\pi} = 240^\circ$;

д) 4 рад $\quad 4 \cdot 57 \quad 228$; е) 3 рад $\quad 3 \cdot 57 \quad 171$.

7. На адзінкавай акружнасці адзначце пункт, які атрымліваецца паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал:

а) $\frac{5\pi}{6}$; б) $\frac{13\pi}{6}$.

Рашэнне. а) Паколькі $\frac{5\pi}{6} = 150^\circ$, то выканаем паварот пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 150° (рыс. 19, *а*).

б) Паколькі $\frac{13}{6} \quad 2 \quad \frac{\quad}{6}$, то пункт $P_{\frac{13\pi}{6}}$ супадае з пунктам $P_{\frac{\pi}{6}}$ (рыс. 19, *б*).



Рыс. 19

?

1. Выберыце вуглы, якія адпавядаюць пункту $P_0(1;\ 0)$ адзінкавай акружнасці:

а) 0°; б) 180°; в) 90°; г) –360°.

2. Якія з дадзеных пунктаў адзінкавай акружнасці супадаюць:

а) P_α; б) $P \quad _{180}$; в) $P \quad _{360}$; г) $P \quad _{90}$?

1.3. Знайдзіце градусную меру вугла, паказанага на рысунку 20.



Рыс. 20

1.4. Начарціце адзінкавую акружнасць і адзначце пункты, якія атрымліваюцца паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал:

а) 150°; 210°; 540°; –45°; –135°; –720°;

б) –43°; 137°; –456°; 280°; –189°; 763°.



Рыс. 21

1.5. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α, P_β і P_γ, якія адпавядаюць вуглам павароту α, β і γ (рыс. 21). Запішыце градусныя меры вуглоў α, β і γ, калі вядома, што яны змяшчаюцца ў прамежку:

а) ад 0° да 360°;

б) ад –360° да 0°;

в) ад 720° да 1080°.

1.6. Запішыце два дадатныя і два адмоўныя вуглы α, для якіх пункт P_α супадае з пунктам:

а) $P_{45°}$; б) $P_{-330°}$.

1.7. Сярод вуглоў павароту α, роўных 770°; 480°; –50°; 1560°; –240°; –310°, знайдзіце такія, для якіх пункт P_α супадае з пунктам:

а) $P_{50°}$; б) $P_{120°}$.



Рыс. 22

1.8. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α і P_β, якія адпавядаюць вуглам павароту α і β (рыс. 22). Запішыце ўсе такія вуглы α і β.

1.9. Запішыце ўсе вуглы α, для якіх пункт P_α супадае з пунктам:

а) $P_{180°}$; б) $P_{117°}$; в) $P_{245°}$; г) $P_{-107°}$.

1.10. Выразіце ў градусах вугал, радыянная мера якога роўна:

а) $-\pi$; б) $\frac{\pi}{3}$; в) $\frac{7\pi}{12}$; г) $\frac{3}{5}$.

1.11. Выразіце ў радыянах вугал:

а) 10°; б) –135°; в) –1200°; г) 720°.

1.12. Выразіце ў градусах вугал:

а) 3 рад; б) 0,8 рад; в) –6 рад; г) –1,1 рад.

1.13. Начарціце адзінкавую акружнасць і адзначце пункты, якія атрымліваюцца паваротам пункта $P_0(1; 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал: $\frac{}{6}$; $\frac{}{4}$; $\frac{3}{2}$; $\frac{7}{6}$; $\frac{9}{4}$; $\frac{7}{6}$. Колькі розных пунктаў атрымалася?

1.14. Вызначце, вуглом якой чвэрці з'яўляецца вугал α, калі:

а) $\alpha = 126°$; б) $\alpha = -189°$; в) $\alpha = 722°$; г) $\frac{}{3}$; д) $\frac{3}{4}$;

е) $\frac{11}{5}$; ж) $\alpha = 2$; з) $\alpha = -4$; і) $\alpha = 7$; к) $\alpha = -3$.

1.15. Вызначце, у якой чвэрці знаходзіцца вугал α, калі:

а) $< \quad < \frac{3}{2}$; б) $\frac{}{2} < \quad <$; в) $\frac{3}{2} < \quad < 2$; г) $\frac{3}{2} < \quad <$.

1.16. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α і P_β, якія адпавядаюць вуглам павароту α і β (рыс. 23). Запішыце радыянныя меры вуглоў α і β, калі вядома, што яны змяшчаюцца ў прамежку:

а) ад 0 да 2π; б) ад -2π да 0; в) ад 2π да 4π.

1.17. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α і P_β, якія адпавядаюць вуглам павароту α і β (рыс. 24). Запішыце (у радыянах) усе такія вуглы α і β.



Рыс. 23



Рыс. 24

1.18. Начарціце адзінкавую акружнасць і адзначце пункты, якія атрымліваюцца паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал 1 рад; 3 рад; –4 рад; 6 рад.

1.19. Колькі поўных абаротаў утрымлівае вугал, радыянная мера якога роўна: 4π; -6π; 12π; -100π? У якім напрамку пункт $P_0(1;\ 0)$ рухаецца па акружнасці ў кожным выпадку?

1.20. Як размешчаны на адзінкавай акружнасці пункты, атрыманыя паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ на вуглы:

а) α і $\alpha + 2\pi$;

б) α і $\alpha + \pi$;

в) α і $-\alpha$?

1.21. Вызначце від трохвугольніка, калі радыянная мера двух яго вуглоў роўна $\frac{2\pi}{5}$ і $\frac{3\pi}{10}$.

1.22. Выразіце ў градусах і радыянах вугал, на які паварочваецца мінутная стрэлка гадзінніка за 15, 20, 30 і 60 мінут.

1.23. Выразіце ў градусах і радыянах вугал, на які на працягу адных сутак паварочваецца:

а) гадзіннікавая стрэлка гадзінніка;

б) мінутная стрэлка гадзінніка.

1.24. Знайдзіце градусную меру вугла, паказанага на рысунку 25.



Рыс. 25

1.25. Начарціце адзінкавую акружнасць і адзначце пункты, якія атрымліваюцца паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал:

а) 120°; –90°; 450°; 240°;

б) 38°; 185°; –295°; 724°.

1.26. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α і P_β, якія адпавядаюць вуглам павароту α і β (рыс. 26). Запішыце градусныя меры вуглоў α і β, калі вядома, што яны знаходзяцца ў прамежку:

а) ад 0° да 360°; б) ад –360° да 0°;
в) ад 360° да 720°.



Рыс. 26

1.27. Запішыце два дадатныя і два адмоўныя вуглы α, для якіх пункт P_α супадае з пунктам:

а) $P_{225°}$; б) $P_{-60°}$.

1.28. Запішыце ўсе вуглы α, для якіх пункт P_α супадае з пунктам:

а) $P_{90°}$; б) $P_{-68°}$; в) $P_{318°}$; г) $P_{-125°}$.

1.29. Выразіце ў градусах вугал: а) $\frac{\pi}{4}$; б) $\frac{11}{18}$; в) $\frac{5}{2}$.

1.30. Выразіце ў радыянах вугал: а) 18°; б) –60°; в) –1080°.

1.31. Выразіце ў градусах вугал: а) 4 рад; б) –0,5 рад.

1.32. Начарціце адзінкавую акружнасць і адзначце пункты, якія атрымліваюцца паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ вакол пачатку каардынат на вугал: $\frac{}{3}$; $\frac{3}{4}$; ; $\frac{7}{6}$; $\frac{7}{3}$.

1.33. Вызначце, вуглом якой чвэрці з'яўляецца вугал α, калі:

а) α = 213°; б) α = –352°; в) $\frac{7}{10}$; г) $\frac{}{6}$;
д) α = 4; е) α = –1; ж) α = 9; з) α = –5.

1.34. Вызначце, у якой чвэрці знаходзіцца вугал α, калі:

а) 0° < α < 90°; б) 180° < α < 270°;
в) –180° < α < –90°; г) 360° < α < 450°.

1.35. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α і P_β, якія адпавядаюць вуглам павароту α і β (рыс. 27). Запішыце ўсе такія вуглы α і β, выкарыстаўшы радыянную меру.



Рыс. 27

1.36. Знайдзіце градусную меру ўсіх вуглоў трохвугольніка, калі радыянная мера двух яго вуглоў роўна $\frac{\pi}{15}$ і $\frac{3\pi}{15}$.

1.37. Выразіце ў градусах і радыянах вугал, на які на працягу дзвюх гадзін павернецца:

а) мінутная стрэлка гадзінніка;
б) секундная стрэлка гадзінніка.

1.38. З дадзеных пунктаў выберыце пункт з адмоўнай абсцысай:
а) $A(-2;\ 3)$; б) $B(5;\ -8)$; в) $C(0;\ -7)$; г) $D(4;\ 0)$.

1.39. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $9 + 2\frac{3}{8}$; б) $9 - 2\frac{3}{8}$; в) $2\frac{3}{8} - 9$; г) $-9 - 2\frac{3}{8}$; д) $-2\frac{3}{8} + 9$.

§ 2. Азначэнне сінуса і косінуса адвольнага вугла

1.40. З пунктаў $A(-4;\ 0)$; $B(0;\ 3)$; $C(4;\ 1)$; $D(1;\ 0)$; $E\ 0;\ \frac{1}{2}$ выберыце пункты, якія ляжаць на восі:
а) абсцыс; б) ардынат.

1.41. З пунктаў $A(-4;\ 6)$; $B(3;\ -7)$; $C(-1;\ -10)$; $D(0{,}1;\ -0{,}4)$; $E(-0{,}3;\ -0{,}4)$; $F(1;\ 0{,}5)$ выберыце пункты, якія ляжаць у:
а) першай чвэрці; б) другой чвэрці;
в) трэцяй чвэрці; г) чацвёртай чвэрці.

1.42. Назавіце некалькі пунктаў, якія ляжаць:
а) на восі ардынат; б) на восі абсцыс;
в) у трэцяй чвэрці; г) у чацвёртай чвэрці.

Пры вывучэнні геаметрыі вы разглядалі адносіны старон у прамавугольным трохвугольніку і пазнаёміліся з паняццямі сінуса, косінуса, тангенса і катангенса вострага вугла (рыс. 28).

Пабудуем пункт $P_\alpha(x_\alpha;\ y_\alpha)$ адзінкавай акружнасці паваротам пункта P_0 вакол пачатку каардынат на вугал α (рыс. 29).



Рыс. 28



Рыс. 29

Разгледзім прамавугольны трохвугольнік $P_\alpha OH$, у якім гіпатэнуза $P_\alpha O$ роўна 1 (радыусу адзінкавай акружнасці). Па азначэнні сінуса і косінуса вострага вугла атрымаем: $\sin \quad \frac{\quad}{\quad} \quad \frac{\quad}{1}$, $\cos \quad \frac{\quad}{\quad} \quad \frac{\quad}{1}$.

Такім чынам, сінус вугла α роўны ардынаце пункта P_α, а косінус вугла α роўны абсцысе пункта P_α.

Паколькі ў трыганаметрыі разглядаюцца вуглы $\alpha \in (-\infty; +\infty)$, то дадзім азначэнне сінуса і косінуса для любога вугла α.

Азначэнне. Сінусам вугла α называецца **ардыната** пункта P_α, атрыманага паваротам пункта $P_0(1; 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на вугал α:

$$\sin\alpha = y_\alpha \text{ (рыс. 30).}$$

Косінусам вугла α называецца **абсцыса** пункта P_α, атрыманага паваротам пункта $P_0(1; 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на вугал α:

$$\cos\alpha = x_\alpha \text{ (гл. рыс. 30).}$$



Рыс. 30

Для таго каб знайсці сінус і косінус адвольнага вугла α, трэба:

① Пабудаваць пункт P_α адзінкавай акружнасці. ② Знайсці ардынату пункта P_α: $\sin\alpha = y_\alpha$. ③ Знайсці абсцысу пункта P_α: $\cos\alpha = x_\alpha$.	Знайдзіце сінус і косінус вугла $\alpha = 215°$. ①  ② $\sin 215 \quad y_{215} \quad 0{,}6$. ③ $\cos 215 \quad x_{215} \quad 0{,}8$.

Значэнні сінуса і косінуса адвольнага вугла з дапамогай адзінкавай акружнасці ў асноўным можна вызначыць толькі прыбліжана.

Аднак для некаторых вуглоў значэнні сінуса і косінуса можна вызначыць дакладна. Знойдзем значэнні сінуса і косінуса для вуглоў, якія адпавядаюць пунктам перасячэння акружнасці з восямі каардынат (0; $\frac{\pi}{2}$; π; $\frac{3\pi}{2}$ і 2π). Вызначым $\sin\frac{\pi}{2}$ і $\cos\frac{\pi}{2}$. Вуглу $\frac{}{2}$ адпавядае пункт $P_{\frac{\pi}{2}}$, які мае каардынаты (0; 1). Па азначэнні сінус вугла $\frac{}{2}$ роўны ардынаце пункта $P_{\frac{\pi}{2}}$, значыць, $\sin\frac{}{2}$ 1. Косінус вугла $\frac{}{2}$ роўны абсцысе пункта $P_{\frac{\pi}{2}}$, г. зн. $\cos\frac{}{2}$ 0 (рыс. 31).



Рыс. 31

Выкарыстаўшы азначэнне сінуса і косінуса вугла α, атрымаем, што: $\sin 0 = 0$; $\cos 0 = 1$; $\sin$ 0; $\cos$ 1; $\sin\frac{3}{2}$ 1; $\cos\frac{3}{2}$ 0; $\sin 2$ 0; $\cos 2$ 1.

Паколькі ардынаты і абсцысы пунктаў адзінкавай акружнасці змяняюцца ад –1 да 1, то значэнні сінуса і косінуса адвольнага вугла належаць прамежку [–1; 1], г. зн. $1 \leqslant \sin \leqslant 1$ і $1 \leqslant \cos \leqslant 1$.

$$1 \leqslant \sin \leqslant 1$$
$$1 \leqslant \cos \leqslant 1$$

Напрыклад, высветлім, ці можа $\sin\alpha$ прымаць значэнні, роўныя: $\frac{1}{3}$; $\sqrt{3}$; -2; $-0{,}7$.

Значэнні сінуса адвольнага вугла належаць адрэзку [–1; 1], значыць, $\sin\alpha$ можа прымаць значэнні, роўныя $\frac{1}{3}$ і $-0{,}7$, бо $\frac{1}{3}$ 1; 1 і 0,7 1; 1 . Паколькі $\sqrt{3}$ 1; 1 і 2 1; 1 , то $\sin\alpha$ не можа прымаць значэнні, роўныя $\sqrt{3}$ і –2.

Па азначэнні сінуса і косінуса вугла α, сінус вугла α роўны ардынаце пункта P_α, а косінус вугла α роўны абсцысе гэтага пункта. Значыць, знакі $\sin\alpha$ і $\cos\alpha$ супадаюць са знакамі ардынаты і абсцысы пункта P_α адпаведна.

Прыклад 1. Вызначце знак выразу:

а) $\sin 130°$; б) $\cos 258°$; в) $\sin(-150°)$; г) $\cos(-340°)$.

Рашэнне. а) Паколькі 130° — вугал другой чвэрці (рыс. 32), а ардынаты пунктаў адзінкавай акружнасці, якія знаходзяцца ў другой чвэрці, дадатныя, то $\sin 130° > 0$.

б) Паколькі 258° — вугал трэцяй чвэрці (гл. рыс. 32), а абсцысы пунктаў адзінкавай акружнасці, якія знаходзяцца ў трэцяй чвэрці, адмоўныя, то $\cos 258° < 0$.

в) Паколькі –150° — вугал трэцяй чвэрці (гл. рыс. 32), а ардынаты пунктаў адзінкавай акружнасці, якія знаходзяцца ў трэцяй чвэрці, адмоўныя, то $\sin(-150°) < 0$.

г) Паколькі –340° — вугал першай чвэрці (гл. рыс. 32), а абсцысы пунктаў адзінкавай акружнасці, якія знаходзяцца ў першай чвэрці, дадатныя, то $\cos(-340°) > 0$.



Рыс. 32

З геаметрыі нам вядомы значэнні сінусаў і косінусаў вострых вуглоў (гл. табл.).

Градусы	30°	45°	60°
Радыяны	$\frac{\pi}{6}$	$\frac{\pi}{4}$	$\frac{\pi}{3}$
$\sin\alpha$	$\frac{1}{2}$	$\frac{\sqrt{2}}{2}$	$\frac{\sqrt{3}}{2}$
$\cos\alpha$	$\frac{\sqrt{3}}{2}$	$\frac{\sqrt{2}}{2}$	$\frac{1}{2}$

З дапамогай гэтых значэнняў можна знаходзіць значэнні сінусаў і косінусаў некаторых іншых вуглоў α.

Прыклад 2. Вылічыце:

а) $\sin(\ 60\ )$ і $\cos(\ 60\ )$; б) $\sin 120°$ і $\cos 120°$;

в) $\sin 240°$ і $\cos 240°$; г) $\sin 420°$ і $\cos 420°$.

Рашэнне. а) Адзначым на адзінкавай акружнасці пункт $P_{60°}$. Паколькі вядома, што $\sin 60\ \ \frac{\sqrt{3}}{2}$, а $\cos 60\ \ \frac{1}{2}$, то ардыната пункта $P_{60°}$ роўна $\frac{\sqrt{3}}{2}$, а абсцыса гэтага пункта роўна $\frac{1}{2}$.



Рыс. 33

Пункты $P_{60°}$ і $P_{-60°}$ адзінкавай акружнасці сіметрычныя адносна восі абсцыс (рыс. 33), значыць, іх ардынаты (сінусы вуглоў 60° і –60°) процілеглыя, а абсцысы (косінусы вуглоў 60° і –60°) роўныя. Такім чынам, $\sin(\ 60\ )\ \ \frac{\sqrt{3}}{2}$, а $\cos(\ 60\ )\ \ \frac{1}{2}$.



Рыс. 34



Рыс. 35



Рыс. 36

б) Паколькі $120° = 180° - 60°$, то пункты $P_{60°}$ і $P_{120°}$ адзінкавай акружнасці сіметрычныя адносна восі ардынат (рыс. 34). Тады іх ардынаты (сінусы вуглоў 60° і 120°) роўныя, а абсцысы (косінусы вуглоў 60° і 120°) процілеглыя. Значыць, $\sin 120 \quad \frac{\sqrt{3}}{2}$, а $\cos 120 \quad \frac{1}{2}$.

в) Пункты $P_{60°}$ і $P_{240°}$ адзінкавай акружнасці сіметрычныя адносна пачатку каардынат (рыс. 35), паколькі $240° = 180° + 60°$. Тады і іх ардынаты процілеглыя, і іх абсцысы процілеглыя, г. зн. $\sin 240 \quad \frac{\sqrt{3}}{2}$, а $\cos 240 \quad \frac{1}{2}$.

г) Паколькі $420° = 60° + 360°$, то пункты $P_{60°}$ і $P_{420°}$ адзінкавай акружнасці супадаюць (рыс. 36), а значыць, іх каардынаты роўныя. Тады $\sin 420 \quad \frac{\sqrt{3}}{2}$, а $\cos 420 \quad \frac{1}{2}$.

*Прыклад 3**. Вылічыце:

а) $\cos\frac{9\pi}{4}$; б) $\cos \quad \frac{3}{4}$.

Рашэнне. а) Паколькі $\frac{9}{4} \quad \frac{8}{4} \quad 2 \quad \frac{}{4}$, то пункт $P_{\frac{9\pi}{4}}$ адзінкавай акружнасці супадае з пунктам $P_{\frac{\pi}{4}}$ (рыс. 37).



Рыс. 37

Паколькі $\cos\frac{}{4} \quad \frac{\sqrt{2}}{2}$, то $\cos\frac{9}{4} \quad \frac{\sqrt{2}}{2}$.

б) Пункты $P_{\frac{3}{4}}$ і $P_{\frac{\pi}{4}}$ адзінкавай акружнасці сіметрычныя адносна пачатку каардынат (гл. рыс. 37), а значыць, іх абсцысы (косінусы вуглоў $\frac{\pi}{4}$ і $\frac{3}{4}$) адрозніваюцца толькі знакам. Паколькі $\cos\frac{}{4} \quad \frac{\sqrt{2}}{2}$, то $\cos \quad \frac{3}{4} \quad \frac{\sqrt{2}}{2}$.

Прыклад 4. Пабудуйце адзін з вуглоў, калі:

а) sin $\frac{1}{4}$; б) cos 0,8.

Рашэнне. а) Паколькі y sin , то на восі ардынат адзначым $\frac{1}{4}$. Правядзём прамую, паралельную восі абсцыс, і знойдзем на адзінкавай акружнасці пункты P_{α_1} і P_{α_2}, ардыната кожнага з якіх роўна $\frac{1}{4}$. Адзначым адзін з вуглоў, які адпавядае пунктам P_{α_1} або P_{α_2} (рыс. 38, *а*).

б) Паколькі x cos , то на восі абсцыс адзначым 0,8. Правядзём прамую, паралельную восі ардынат, і знойдзем на адзінкавай акружнасці пункты P_{α_1} і P_{α_2}, абсцыса кожнага з якіх роўна 0,8. Адзначым адзін з вуглоў, які адпавядае пунктам P_{α_1} або P_{α_2} (рыс. 38, *б*).



Рыс. 38

Прыклады асноўных заданняў і іх рашэнні

1. Пункт P_α адзінкавай акружнасці мае каардынаты P $\frac{1}{5}$; $\frac{2\sqrt{6}}{5}$. Выкарыстаўшы азначэнне сінуса і косінуса адвольнага вугла, знайдзіце $\sin\alpha$ і $\cos\alpha$.

Рашэнне. Сінусам вугла α называецца ардыната пункта P_α, атрыманага паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на вугал α. Па ўмове ардыната пункта P_α роўна $-\frac{2\sqrt{6}}{5}$, значыць, sin $\frac{2\sqrt{6}}{5}$.

Косінусам вугла α называецца абсцыса пункта P_α, атрыманага паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на вугал α. Па ўмове абсцыса пункта P_α роўна $\frac{1}{5}$, значыць, $\cos \quad \frac{1}{5}$.

2. Калі $\sin\alpha = -1$, то вугал α можа быць роўны:

а) 180°; б) 90°; в) –90°;
г) –180°; д) –270°.

Выберыце правільны адказ.

Рашэнне. Паколькі сінусам вугла α называецца ардыната пункта P_α, атрыманага паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на вугал α, то трэба знайсці пункт адзінкавай акружнасці, ардыната якога роўна –1. Гэты пункт ляжыць на восі ардынат, і з дадзеных вуглоў яму адпавядае вугал $\alpha = -90°$ (рыс. 39). Правільны адказ в).



Рыс. 39

3. Калі $\cos\alpha = 0$, то вугал α можа быць роўны:

а) 180°; б) 360°; в) 450°;
г) 900°; д) –360°.

Выберыце правільны адказ.

Рашэнне. Паколькі косінусам вугла α называецца абсцыса пункта P_α, атрыманага паваротам пункта $P_0(1;\ 0)$ адзінкавай акружнасці вакол пачатку каардынат на вугал α, то трэба знайсці пункт адзінкавай акружнасці, абсцыса якога роўна 0. Гэты пункт ляжыць на восі ардынат, і з дадзеных вуглоў яму адпавядае вугал $\alpha = 450°$ (рыс. 40). Правільны адказ в).



Рыс. 40

4. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\cos 180° + \sin 90°$; б) $\cos \frac{\ }{2} \quad \sin \frac{3}{2}$.

Рашэнне. а) Абсцыса пункта $P_{180°}$, які адпавядае вуглу 180°, роўна –1 (рыс. 41), значыць, $\cos 180° = -1$. Ардыната пункта $P_{90°}$, які адпавядае вуглу 90°, роўна 1 (гл. рыс. 41), г. зн. $\sin 90° = 1$. Значыць, $\cos 180$ $\sin 90$ 1 1 0.



Рыс. 41



Рыс. 42

б) cos $\frac{\ }{2}$ 0, а sin $\frac{3}{2}$ 1 (рыс. 42), тады cos $\frac{\ }{2}$ sin $\frac{3}{2}$ $= 0 - 1 = -1$.

5. Ці можа $\cos\alpha$ быць роўным:

а) 1,2; б) 0,89; в) $-\sqrt{5}$; г) $-\frac{3}{7}$?

Рашэнне. Паколькі 1 ⩽ cos ⩽1, то $\cos\alpha$:

а) не можа быць роўным 1,2, бо 1,2 1; 1 ;

б) можа быць роўным 0,89, бо 0,89 1; 1 ;

в) не можа быць роўным $-\sqrt{5}$, бо $\sqrt{5}$ 1; 1 ;

г) можа быць роўным $-\frac{3}{7}$, бо $\frac{3}{7}$ 1; 1 .

6. Вызначце знак выразу:

а) $\cos(-49°)$; б) $\cos(-297°)$; в) $\sin\frac{18\pi}{19}$; г) $\sin 6$.

Рашэнне. а) $\cos(-49°) > 0$, паколькі $-49°$ — вугал чацвёртай чвэрці, а косінус у чацвёртай чвэрці дадатны;

б) $\cos(-297°) > 0$, паколькі $-297°$ — вугал першай чвэрці, а косінус у першай чвэрці дадатны;

в) $\sin\frac{18\pi}{19} > 0$, паколькі $\frac{18\pi}{19}$ — вугал другой чвэрці, а сінус у другой чвэрці дадатны;

г) $\sin 6 < 0$, паколькі 6 радыян — вугал чацвёртай чвэрці, а сінус у чацвёртай чвэрці адмоўны.

7. Параўнайце: а) $\sin 122°$ і $\sin 170°$; б) $\cos\frac{\pi}{8}$ і $\cos\frac{10\pi}{9}$.

Рашэнне. а) Адзначым на адзінкавай акружнасці пункты, якія адпавядаюць вуглам 122° і 170°, і параўнаем ардынаты гэтых пунктаў. Ардыната пункта $P_{122°}$ большая за ардынату пункта $P_{170°}$ (рыс. 43), значыць, $\sin 122° > \sin 170°$.

б) Параўнаем абсцысы пунктаў адзінкавай акружнасці $P_{\frac{10\pi}{9}}$ і $P_{\frac{\pi}{8}}$.

Паколькі абсцыса пункта $P_{\frac{\pi}{8}}$ большая за абсцысу пункта $P_{\frac{10\pi}{9}}$ (рыс. 44), то $\cos\frac{\pi}{8} > \cos\frac{10\pi}{9}$.



Рыс. 43



Рыс. 44

8. З дапамогай адзінкавай акружнасці знайдзіце значэнне:

а) $\sin\frac{5\pi}{6}$; б) $\cos\frac{5\pi}{6}$.

Рашэнне. а) Ардыната пункта $P_{\frac{5\pi}{6}}$ роўна ардынаце пункта $P_{\frac{\pi}{6}}$ (рыс. 45), таму

$\sin\frac{5}{6} \quad \sin\frac{}{6} \quad \frac{1}{2}$.

б) Абсцыса пункта $P_{\frac{5\pi}{6}}$ процілеглая абсцысе пункта $P_{\frac{\pi}{6}}$ (гл. рыс. 45), таму

$\cos\frac{5}{6} \quad \cos\frac{}{6} \quad \frac{\sqrt{3}}{2}$.



Рыс. 45

1. Абсцыса пункта P_α адзінкавай акружнасці роўна 0,3. Тады правільная роўнасць:
а) sin   0,3;   б) sin   0,3;   в) cos   0,3;   г) cos   0,3.
Выберыце правільны адказ.
2. Вядома, што вуглам α і β адпавядаюць пункты $P \quad \frac{3}{5}; \frac{4}{5}$ і $P \quad \frac{1}{4}; \frac{\sqrt{15}}{4}$. Выберыце ўсе правільныя роўнасці:

а) $\sin \quad \frac{4}{5}$;   б) $\sin \quad \frac{3}{5}$;   в) $\cos \quad \frac{1}{4}$;   г) $\cos \quad \frac{\sqrt{15}}{4}$.

1.43. Выкарыстаўшы азначэнне сінуса і косінуса адвольнага вугла, знайдзіце $\sin\alpha$ і $\cos\alpha$, калі вядома, што пункт P_α адзінкавай акружнасці мае каардынаты:

а) $P \quad \frac{3}{5}; \frac{4}{5}$;   б) $P \quad \frac{5}{13}; \quad \frac{12}{13}$;

в) $P \quad \frac{1}{7}; \quad \frac{4\sqrt{3}}{7}$;   г) $P \quad 0,8; 0,6$.

У якой каардынатнай чвэрці размешчаны кожны пункт?

1.44. З дапамогай адзінкавай акружнасці (рыс. 46) знайдзіце прыблізныя значэнні сінуса і косінуса вугла: а) 40°; б) 170°; в) 250°; г) –70°.

1.45. З дапамогай адзінкавай акружнасці (рыс. 47) знайдзіце прыблізнае значэнне выразу:

а) $\sin\frac{2\pi}{5}$;   б) $\cos \quad \frac{}{8}$;   в) $\sin\frac{13\pi}{10}$;   г) $\cos 0,6\pi$.

1.46. Для некаторага вугла α вядома, што $\sin\alpha = 1$. Тады вугал α можа быць роўным: а) 90°; б) 270°; в) –180°; г) 450°. Выберыце правільны адказ.

Назавіце яшчэ два дадатныя і два адмоўныя вуглы α, для якіх правільная роўнасць $\sin\alpha = 1$.



Рыс. 46



Рыс. 47

1.47. Адзначце на адзінкавай акружнасці пункты, якія адпавядаюць усім такім вуглам α, для кожнага з якіх справядлівая роўнасць:

а) $\sin\alpha = 0$; б) sin $\frac{1}{2}$; в) sin $\frac{1}{3}$;

г) $\cos\alpha = 1$; д) cos $\frac{2}{5}$; е) cos $\frac{3}{5}$.

1.48. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\cos 180° - \sin 270°$; б) $\sin 0° - \cos 0°$;
в) $2\cos(-180°) - \sin 360°$; г) $\sin(-180°) + 5\sin(-270°)$;
д) $-\sin 90° + 3\cos 0°$; е) $8\sin 180° - 6\cos(-270°)$.

1.49. Вылічыце:

а) $\cos 360° \cdot \cos 30° \cdot \sin 45°$; б) sin 90 cos 60 sin 30 ;

в) cos 90 $\cos^2$ 30 ; г) sin 450 cos 60 $\sin^2$ 45 .

1.50. Знайдзіце значэнне выразу:

а) sin $\frac{}{2}$ · sin $\frac{}{2}$; б) cos sin $\frac{3}{2}$;

в) sin $\frac{3}{2}$ 2cos ; г) 2sin 2 cos ;

д) sin $\frac{}{2}$ · cos · cos 2 ; е) sin $\frac{}{2}$ 8sin cos 2 .

1.51. Вылічыце:

а) sin $\frac{3}{2}$ sin $\frac{}{6}$; б) cos 2 · cos $\frac{}{4}$;

в) sin $\sin^2$ $\frac{}{4}$; г) 3cos 5 sin $\frac{}{6}$ · cos $\frac{}{3}$.

1.52. Ці праўда, што:

а) sin $\frac{}{2}$ sin $\frac{}{2}$; б) sin $\frac{3}{2}$ sin $\frac{}{2}$;

в) cos cos ; г) cos $\frac{}{2}$ cos $\frac{3}{2}$?

1.53. Якія значэнні можа прымаць сінус адвольнага вугла? З лікаў $\frac{3}{7}$; -5; 1,2; $-0{,}8$; $\sqrt{3}$; 0; $\frac{1}{\sqrt{5}}$ выберыце тыя, якім можа быць роўны $\sin\alpha$.

1.54. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α, P_β, P_γ і P_φ, якія адпавядаюць вуглам павароту α, β, γ і φ (рыс. 48). Параўнайце з нулём значэнні сінуса і косінуса гэтых вуглоў.



Рыс. 48

1.55. Вызначце знак выразу:

а) $\cos 811°$; б) $\sin \frac{2}{9}$;

в) $\sin 4$; г) $\cos 6$.

1.56. Вызначце знак выразу:

а) $\cos 451° \cdot \sin(-92°)$; б) $\sin \frac{7}{9} \cdot \cos 1{,}1$.

1.57. Вуглом якой чвэрці з'яўляецца вугал α, калі:

а) $\sin\alpha > 0$ і $\cos\alpha > 0$; б) $\sin\alpha < 0$ і $\cos\alpha > 0$?

1.58. Параўнайце:

а) $\sin 40°$ і $\sin 50°$; б) $\sin 100°$ і $\sin 110°$;
в) $\sin(-20°)$ і $\sin(-40°)$; г) $\sin 192°$ і $\sin 48°$.

1.59. Параўнайце:

а) $\cos\frac{\pi}{8}$ і $\cos\frac{5\pi}{8}$; б) $\cos 0{,}7\pi$ і $\cos 0{,}8\pi$;

в) $\cos \frac{3}{10}$ і $\cos \frac{7}{10}$; г) $\cos 1{,}1\pi$ і $\cos 0{,}1\pi$.

1.60. Параўнайце:

а) $\sin 3$ і $\sin\pi$; б) $\cos 4$ і $\cos 5$; в) $\sin 1$ і $\cos 1$.

1.61. Ці праўда, што:

а) $\sin(-45°) = -\sin 45°$; б) $\cos(-60°) = -\cos 60°$;
в) $\sin 120° = \sin 60°$; г) $\cos 135° = -\cos 45°$?

1.62. З дапамогай адзінкавай акружнасці знайдзіце:

а) $\sin(-30°)$ і $\cos(-30°)$; б) $\sin 150°$ і $\cos 150°$;
в) $\sin 210°$ і $\cos 210°$; г) $\sin 390°$ і $\cos 390°$.

1.63. З вуглоў 60°; 120°; 300°; –60°; –210°; 420°; –780° выберыце тыя, косінусы якіх роўны $\frac{1}{2}$.

1.64. Пабудуйце адзін з вуглоў α, для якога:

а) $\sin\alpha = 0{,}6$; б) $\cos \frac{2}{3}$.

1.65*. З дапамогай адзінкавай акружнасці і значэнняў сінусаў і косінусаў вуглоў $\frac{\pi}{6}$, $\frac{\pi}{4}$ і $\frac{\pi}{3}$ (гл. табл. на с. 21) вылічыце:

а) $\sin\frac{3\pi}{4}$; б) $\cos\frac{7\pi}{6}$;

в) $\sin \frac{5}{3}$; г) $\cos\frac{19\pi}{6}$.

1.66. Выкарыстаўшы азначэнне сінуса і косінуса адвольнага вугла, знайдзіце $\sin\alpha$ і $\cos\alpha$, калі вядома, што пункт P_α адзінкавай акружнасці мае каардынаты: а) $P \quad 0{,}6; 0{,}8$; б) $P \quad \frac{8}{17}; \ \frac{15}{17}$.

У якой каардынатнай чвэрці размешчаны кожны пункт?

1.67. З дапамогай адзінкавай акружнасці (гл. рыс. 46) знайдзіце прыбліжаныя значэнні сінуса і косінуса вугла:

а) 70°; б) 220°; в) –80°.

1.68. З дапамогай адзінкавай акружнасці (гл. рыс. 47) знайдзіце прыбліжанае значэнне выразу:

а) $\cos\frac{\pi}{5}$; б) $\sin \quad \frac{3}{5}$; в) $\cos\frac{11\pi}{9}$.

1.69. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α, P_β, P_γ і P_φ, якія адпавядаюць вуглам павароту α, β, γ і φ (рыс. 49). Знайдзіце:

а) $\sin\alpha$; б) $\cos\varphi$; в) $\sin\gamma$;
г) $\cos\gamma$; д) $\sin\beta$; е) $\cos\beta$.



Рыс. 49

1.70. Назавіце два дадатныя і два адмоўныя вуглы α, для якіх правільная роўнасць $\sin\alpha = 0$.

1.71. Адзначце на адзінкавай акружнасці пункты, якія адпавядаюць усім вуглам α, для кожнага з якіх справядлівая роўнасць:

а) $\cos\alpha = 0$; б) $\cos \quad \frac{1}{2}$; в) $\sin\alpha = -1$; г) $\sin \quad \frac{1}{4}$.

1.72. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sin 90 \quad \cos 180$; б) $\cos \quad 180 \quad 2\sin 270$;

в) $\sin 180 \quad 5\cos \quad 270$; г) $\cos 180 \quad \cos 60$;

д) $\cos 0° \cdot \sin 45° \cdot \cos 45°$; е) $\sin \quad 90 \quad \sin^2 60$.

1.73. Вылічыце:

а) $\sin\frac{}{2} \quad 2\cos$; б) $\sin \quad \frac{}{2} \quad \cos\frac{3}{2}$;

в) $\cos \quad 2 \quad 2\cos\frac{}{3}$; г) $\cos\pi \cdot \cos\frac{\pi}{6}$;

д) $\sin\frac{3}{2} \quad \cos\frac{}{6} \cdot \sin\frac{}{3}$; е) $\sin \quad \cos^2\frac{}{4}$.

1.74. Якія значэнні можа прымаць косінус адвольнага вугла? Сярод лікаў $\frac{2}{5}$; -3; $2{,}4$; $-0{,}3$; $\sqrt{2}$; 1; $\frac{1}{\sqrt{7}}$ выберыце тыя, якім можа быць роўны $\cos\alpha$.

1.75. На адзінкавай акружнасці адзначаны пункты P_α, P_β, P_γ і P_φ, якія адпавядаюць вуглам α, β, γ і φ (рыс. 50). Параўнайце з нулём значэнні сінуса і косінуса гэтых вуглоў.



Рыс. 50

1.76. Вызначце знак выразу:

а) $\cos 1125°$; б) $\sin \quad \frac{12}{17} \quad$;

в) $\sin 3$; г) $\cos\frac{15\pi}{8}$.

1.77. Параўнайце:

а) $\sin 130°$ і $\sin 140°$; б) $\cos 40°$ і $\cos 50°$;
в) $\cos(-80°)$ і $\cos(-81°)$; г) $\sin(-22°)$ і $\sin(-43°)$.

1.78. Вуглом якой чвэрці з'яўляецца вугал α, калі:

а) $\sin\alpha > 0$ і $\cos\alpha < 0$; б) $\sin\alpha < 0$ і $\cos\alpha < 0$?

1.79. З дапамогай адзінкавай акружнасці знайдзіце:

а) $\sin \quad 45 \quad$ і $\cos \quad 45 \quad$; б) $\sin 135°$ і $\cos 135°$;
в) $\sin 225°$ і $\cos 225°$; г) $\sin 405°$ і $\cos 405°$.

1.80. З вуглоў 30 ; 120 ; 60 ; 210 ; 330 ; 750 выберыце тыя, сінусы якіх роўны $\frac{1}{2}$.

1.81. Пабудуйце адзін з вуглоў α, для якога: а) $\cos \quad \frac{3}{4}$; б) $\sin\alpha = -0{,}2$.

1.82*. Вылічыце:

а) $\cos\frac{2\pi}{3}$; б) $\sin\frac{7\pi}{6}$; в) $\sin \quad \frac{7}{3} \quad$; г) $\cos\frac{21\pi}{4}$.

1.83. Для функцыі $g \quad x \quad \frac{x^4 - 5x^2 \quad 4}{x - 1 \quad ^2}$ знайдзіце, калі гэта магчыма:

а) $g(0)$; б) $g(-1)$; в) $g(-2)$; г) $g(1)$.

1.84. Выберыце функцыю, графік якой атрыманы з графіка функцыі $y = -7x^2$ зрухам яго на 4 адзінкі ўніз уздоўж восі ардынат:

а) $y = -7x^2 + 4$; б) $y = -7(x + 4)^2$;
в) $y = -7x^2 - 4$; г) $y = -(7x + 4)^2$.

§ 3. Азначэнне тангенса і катангенса адвольнага вугла

1.85. З дадзеных выразаў выберыце тыя, абсягі вызначэння якіх супадаюць:

а) $\frac{4}{x(x+2)}$; б) $x^3 - 4x^2 + 2$; в) $\frac{8}{x^2} - \frac{3x}{7x+14}$;

г) $\frac{12x-1}{x^2+1}$; д) $\frac{15}{x^2-4}$.

1.86. Знайдзіце абсяг вызначэння функцыі $y \quad \sqrt{x-1 \quad x \quad 3}$.

1.87. З дадзеных функцый выберыце функцыі, якія дасягаюць найменшага значэння пры $x = 1$:

а) $f(x) = 2(x-1)^2$; б) $f(x) = -3(x-1)^2$;
в) $f(x) = (x-1)^2 - 5$; г) $f(x) = (x-1)^2 + 5$.

Пабудуем пункт $P_\alpha(x_\alpha; y_\alpha)$ адзінкавай акружнасці паваротам пункта P_0 вакол пачатку каардынат на вугал α. Разгледзім прамавугольны трохвугольнік $P_\alpha OH$, у якім гіпатэнуза $P_\alpha O$ роўна 1 (радыусу адзінкавай акружнасці), а катэты роўны: cos , sin (рыс. 51).



Рыс. 51

Па азначэнні тангенса вострага вугла атрымаем: tg $\quad \frac{\quad}{\quad} \quad \frac{\sin}{\cos}$.

> **Азначэнне.** Тангенсам вугла α называецца адносіна сінуса вугла α да косінуса вугла α: tg $\quad \frac{\sin}{\cos}$.

Напрыклад, $\operatorname{tg} 0 = \frac{\sin 0}{\cos 0} = \frac{0}{1} = 0$, $\operatorname{tg}\frac{}{6} \quad \frac{\sin\frac{}{6}}{\cos\frac{}{6}} \quad \frac{1}{2} : \frac{\sqrt{3}}{2} \quad \frac{1}{\sqrt{3}}$.

Выкарыстаўшы азначэнне тангенса вугла і значэнні сінуса і косінуса гэтага вугла, знойдзем таксама значэнні тангенсаў вуглоў $\frac{\pi}{} \quad \frac{\pi}{}$:

$$\operatorname{tg}\frac{}{4} \quad \frac{\sin\frac{}{4}}{\cos\frac{}{4}} \quad \frac{\sqrt{2}}{2} : \frac{\sqrt{2}}{2} \quad 1, \quad \operatorname{tg}\frac{}{3} \quad \frac{\sin\frac{}{3}}{\cos\frac{}{3}} \quad \frac{\sqrt{3}}{2} : \frac{1}{2} \quad \sqrt{3}.$$

Паколькі $\cos\frac{}{2} \quad 0$, то $\operatorname{tg}\frac{\pi}{2}$ не існуе.

Праз пункт P_0 правядзём прамую, перпендыкулярную восі абсцыс, і прадоўжым прамень OP_α да перасячэння з гэтай прамой у пункце A (рыс. 52). Атрымаем трохвугольнік OAP_0, падобны трохвугольніку $OP_\alpha H$.



Рыс. 52

З падобнасці трохвугольнікаў OAP_0 і $OP_\alpha H$ запішам роўнасць адносін іх старон: $\frac{0}{0}$ ——, або $\frac{AP_0}{1}$ $\frac{\sin}{\cos}$. Паколькі AP_0 $\frac{\sin}{\cos}$ tg , то ардыната пункта A роўна тангенсу вугла α.

Прамая, перпендыкулярная восі абсцыс, якая праходзіць праз пункт P_0, называецца **воссю тангенсаў**.

Для таго каб знайсці тангенс адвольнага вугла α з дапамогай восі тангенсаў, трэба:

① Пабудаваць пункт P_α на адзінкавай акружнасці. ② Прадоўжыць прамую OP_α да перасячэння з воссю тангенсаў. ③ Знайсці ардынату пункта перасячэння прамой OP_α з воссю тангенсаў.	Знайдзіце тангенс вугла $\alpha = 52°$.  ③ $\text{tg}\,52° \approx 1{,}3$.

Значэнне тангенса адвольнага вугла з дапамогай восі тангенсаў можна знайсці толькі прыблізна. Для знаходжання значэння тангенса адвольнага вугла карыстаюцца таксама чатырохзначнымі табліцамі значэнняў тангенса (сінуса, косінуса)* або калькулятарамі. Метады вышэйшай матэматыкі дазваляюць вылічваць значэнні тангенса (сінуса, косінуса) з любой зададзенай ступенню дакладнасці.

* Брадис В. М. Четырехзначные математические таблицы. — 13-е изд., стер. — М. : Дрофа, 2010. — 96 с.

Прыклад 1. Вызначце з дапамогай восі тангенсаў:

а) $\mathrm{tg}\,40°$; б) $\mathrm{tg}\,160°$; в) $\mathrm{tg}\,\frac{\ }{6}$; г) $\mathrm{tg}\,\frac{4\pi}{3}$.

Рашэнне.

а) $\mathrm{tg}\,40° \approx 0{,}8$ (рыс. 53); б) $\mathrm{tg}\,160° \approx -0{,}4$ (гл. рыс. 53);

в) $\mathrm{tg}\,\frac{\ }{6}$ $0{,}6$ (рыс. 54); г) $\mathrm{tg}\,\frac{4}{3}$ $1{,}7$ (гл. рыс. 54).



Рыс. 53



Рыс. 54

Прыклад 2. З дапамогай восі тангенсаў параўнайце значэнні выразаў $\mathrm{tg}\,30°$ і $\mathrm{tg}\,160°$.

Рашэнне. Адзначым на восі тангенсаў пункты, якія адпавядаюць вуглам 30° і 160° (рыс. 55), і параўнаем ардынаты гэтых пунктаў. Ардыната пункта $A_{30°}$ большая за ардынату пункта $A_{160°}$, значыць, $\mathrm{tg}\,30° > \mathrm{tg}\,160°$.



Рыс. 55

Для вуглоў $\frac{\pi}{2}$; $\frac{3\pi}{2}$; $\frac{5\pi}{2}$; … тангенс не існуе, паколькі косінусы гэтых вуглоў роўны нулю. Напрыклад, $\mathrm{tg}\,630°$, $\mathrm{tg}\,\frac{\ }{2}$ не існуюць.

Пабудуем пункт $P_\alpha(x_\alpha; y_\alpha)$ адзінкавай акружнасці паваротам пункта P_0 вакол пачатку каардынат на вугал α. Разгледзім прамавугольны трохвугольнік $P_\alpha OH$, у якім гіпатэнуза $P_\alpha O$ роўна 1 (радыусу адзінкавай акружнасці), а катэты роўны: cos , sin (рыс. 56).

Па азначэнні катангенса вострага вугла атрымаем: —— ——

Азначэнне. Катангенсам вугла α называецца адносіна косінуса вугла α да сінуса вугла α: ——



Рыс. 56

Напрыклад, —— — — —— $\sqrt{}$: — $\sqrt{}$

Паколькі tg $\frac{\sin}{\cos}$, а —— то ——

Выкарыстаем атрыманую роўнасць і знойдзем значэнні катангенсаў вуглоў $\frac{\pi}{4}$ і $\frac{\pi}{3}$: — —— — — $\frac{1}{\mathrm{tg}\,\frac{}{3}}$ $\frac{1}{\sqrt{3}}$.

Паколькі $\sin 0 = 0$, то $\mathrm{ctg}\,0$ не існуе.

Знойдзеныя значэнні сінуса, косінуса, тангенса і катангенса вуглоў 0°; 30°; 45°; 60° і 90° запішам у табліцу.

Градусы	0°	30°	45°	60°	90°
Радыяны	0	$\frac{\pi}{6}$	$\frac{\pi}{4}$	$\frac{\pi}{3}$	$\frac{\pi}{2}$
$\sin\alpha$	0	$\frac{1}{2}$	$\frac{\sqrt{2}}{2}=\frac{1}{\sqrt{2}}$	$\frac{\sqrt{3}}{2}$	1
$\cos\alpha$	1	$\frac{\sqrt{3}}{2}$	$\frac{\sqrt{2}}{2}=\frac{1}{\sqrt{2}}$	$\frac{1}{2}$	0
$\mathrm{tg}\,\alpha$	0	$\frac{\sqrt{3}}{3}=\frac{1}{\sqrt{3}}$	1	$\sqrt{3}$	не існуе
$\mathrm{ctg}\,\alpha$	не існуе	$\sqrt{3}$	1	$\frac{\sqrt{3}}{3}=\frac{1}{\sqrt{3}}$	0

Прыклад 3. Знайдзіце значэнне выразу
$\operatorname{ctg} 45° + \operatorname{ctg} 30° - \operatorname{tg} 60° \quad 2\sin 30$.

Рашэнне. $\sqrt{\ } \quad \sqrt{\ } \quad \cdot -$



Рыс. 57

Праз пункт $P_{90°}(0;\ 1)$ правядзём прамую, перпендыкулярную восі ардынат, і прадоўжым прамень OP_α да перасячэння з гэтай прамой у пункце A (рыс. 57).

Атрымаем трохвугольнік $OAP_{90°}$, падобны трохвугольніку $P_\alpha OH$.

З падобнасці трохвугольнікаў $OAP_{90°}$ і $P_\alpha OH$ запішам роўнасць адносін іх старон: $\frac{\ \ 90}{90}$ $\frac{\quad}{\quad}$, або $\frac{AP_{90}}{1}$ $\frac{\cos}{\sin}$. Паколькі AP $\frac{\quad}{\quad}$ то абсцыса пункта A роўна катангенсу вугла α.

Прамая, перпендыкулярная восі ардынат, якая праходзіць праз пункт $P_{90°}$, называецца **воссю катангенсаў.**

Для таго каб знайсці катангенс адвольнага вугла α з дапамогай восі катангенсаў, трэба:

① Пабудаваць пункт P_α на адзінкавай акружнасці. ② Прадоўжыць прамую OP_α да перасячэння з воссю катангенсаў. ③ Знайсці абсцысу пункта перасячэння прамой OP_α з воссю катангенсаў.	Знайдзіце катангенс вугла α = 24°.  ③ ctg 24° ≈ 2,2.

Значэнне катангенса адвольнага вугла з дапамогай восі катангенсаў можна знайсці толькі прыбліжана.

Прыклад 4. Вызначце з дапамогай восі катангенсаў:

а) ctg 40°; б) ctg 140°; в) ctg $\frac{\ }{6}$; г) ctg $\frac{4\pi}{3}$.

Рашэнне.

а) $\operatorname{ctg} 40° \approx 1{,}2$ (рыс. 58); б) $\operatorname{ctg} 140° \approx -1{,}2$ (гл. рыс. 58);

в) $\operatorname{ctg} \frac{\ }{6}$ 1,7 (рыс. 59); г) $\operatorname{ctg} \frac{4}{3}$ 0,6 (гл. рыс. 59).



Рыс. 58



Рыс. 59

Прыклад 5. З дапамогай восі катангенсаў параўнайце значэнні выразаў $\operatorname{ctg} \frac{2\pi}{5}$ і $\operatorname{ctg} \frac{2\pi}{15}$.

Рашэнне. Адзначым на восі катангенсаў пункты, якія адпавядаюць вуглам $\frac{2\pi}{5}$ і $\frac{2\pi}{15}$ (рыс. 60), і параўнаем абсцысы гэтых пунктаў. Абсцыса пункта $A_{\frac{2\pi}{15}}$ большая за абсцысу пункта $A_{\frac{2\pi}{5}}$, значыць, $\frac{\pi}{\ } > \frac{\pi}{\ }$



Рыс. 60

Для вуглоў 0, π, 2π і г. д. катангенс не існуе, паколькі сінусы гэтых вуглоў роўны нулю. Напрыклад, $\operatorname{ctg} 900°$, $\operatorname{ctg}(-3\pi)$ не існуюць.

Прыклад 6. З дапамогай восі:

а) тангенсаў знайдзіце адзін з вуглоў, тангенс якога роўны $\frac{3}{4}$;

б) катангенсаў знайдзіце адзін з вуглоў, катангенс якога роўны $-\frac{5}{4}$.

Рашэнне. а) ① Адзначым на восі тангенсаў пункт A_α, ардыната якога роўна $\frac{3}{4}$ (рыс. 61).

② Злучым гэты пункт з пачаткам каардынат.
③ Знойдзем адпаведны пункт P_α на адзінкавай акружнасці.
④ Адзначым адзін з вуглоў, які адпавядае гэтаму пункту (гл. рыс. 61).

б) ① Адзначым на восі катангенсаў пункт A_α, абсцыса якога роўна $-\frac{5}{4}$ (рыс. 62).
② Злучым гэты пункт з пачаткам каардынат.
Падставім выразы для α і β у роўнасць $\sin(\alpha+\beta)+\sin(\alpha-\beta)=$ $=\quad \alpha \quad \beta$ і атрымаем **формулу сумы сінусаў двух вуглоў:** $\sin x + \quad y =$ $2\sin\frac{x \quad y}{2}\cos\frac{x \quad y}{2}$.

Вернемся да рашэння ўраўнення $\sin x + \quad x = 0$ і прыменім формулу сумы сінусаў: $\sin x + \quad x = 0 \quad 2\sin\frac{x \quad 5x}{2}\cos\frac{x \quad 5x}{2} \quad 0$

$$\Leftrightarrow \quad x\cos(- \ x) = 0 \Leftrightarrow \quad x \quad x = 0 \Leftrightarrow$$

$$\Leftrightarrow \begin{matrix} \sin 3x \quad 0, & 3x \quad n,\ n \quad \boldsymbol{Z}, & x \quad \frac{n}{3},\ n \quad \boldsymbol{Z}, \\ \cos 2x \quad 0 & 2x \quad \frac{}{2} \quad k,\ k \quad \boldsymbol{Z} & x \quad \frac{}{4} \quad \frac{k}{2},\ k \quad \boldsymbol{Z}. \end{matrix}$$

Адказ: $\frac{n}{3},\ n \quad \boldsymbol{Z};\ \frac{}{4} \quad \frac{k}{2},\ k \quad \boldsymbol{Z}$.

Адняўшы ад роўнасці $\sin(\alpha+\beta)= \quad \alpha \quad \beta + \quad \alpha \quad \beta$ роўнасць $\sin(\alpha-\beta)= \quad \alpha \quad \beta - \quad \alpha \quad \beta$, можна атрымаць **формулу рознасці сінусаў двух вуглоў:** $\sin x - \quad y = 2\sin\frac{x-y}{2}\cos\frac{x+y}{2}$.

Аналагічна, з дапамогай роўнасцей $\cos(\alpha+\beta)= \quad \alpha \quad \beta - \quad \alpha \quad \beta$ і $\cos(\alpha-\beta)= \quad \alpha \quad \beta + \quad \alpha \quad \beta$ можна атрымаць **формулы**

- **сумы косінусаў двух вуглоў:** $\quad x + \quad y \quad 2\cos\frac{x \quad y}{2}\cos\frac{x \quad y}{2}$;
- **рознасці косінусаў двух вуглоў:** $\quad x - \quad y \quad 2\sin\frac{x \quad y}{2}\sin\frac{x \quad y}{2}$.

$$x + \quad y \quad 2\sin\frac{x \quad y}{2}\cos\frac{x \quad y}{2}$$
$$x - \quad y \quad 2\sin\frac{x \quad y}{2}\cos\frac{x \quad y}{2}$$
$$x + \quad y \quad 2\cos\frac{x \quad y}{2}\cos\frac{x \quad y}{2}$$
$$x - \quad y \quad 2\sin\frac{x \quad y}{2}\sin\frac{x \quad y}{2}$$

Прыклад 1. Запішыце ў выглядзе здабытку:

а) $\sin 7x + \quad x$;
б) $\sin 7x - \quad x$;
в) $\cos 7x + \quad x$;
г) $\cos 7x - \quad x$.

Рашэнне. Выкарыстаем формулы пераўтварэння сумы і рознасці ў здабытак і атрымаем:

а) $\sin 7x + \quad x \quad 2\sin\frac{7x \quad 3x}{2}\cos\frac{7x \quad 3x}{2} \quad 2\sin 5x\cos 2x$;

б) $\sin 7x - \quad x \quad 2\sin\frac{7x \quad 3x}{2}\cos\frac{7x \quad 3x}{2} \quad 2\sin 2x\cos 5x$;

в) $\cos 7x + \quad x \quad 2\cos\frac{7x \quad 3x}{2}\cos\frac{7x \quad 3x}{2} \quad 2\cos 5x\cos 2x$;

г) $\cos 7x - \quad x = -2\sin\frac{7x-3x}{2}\sin\frac{7x+3x}{2} = -2\sin 2x\sin 5x$.

Прыклад 2. Скараціце дроб $\frac{\sin 6x \quad \sin 8x}{\sin 6x \quad \sin 8x}$.

Рашэнне. Прыменім формулы сумы і рознасці сінусаў двух вуглоў:

$$\frac{\sin 6x \quad \sin 8x}{\sin 6x \quad \sin 8x} \quad \frac{2\sin 7x\cos \quad x}{2\sin \quad x\cos 7x} \quad \frac{\sin 7x\cos x}{\sin x\cos 7x} \quad \operatorname{tg} 7x \operatorname{ctg} x.$$

Прыклады асноўных заданняў і іх рашэнні

1. Знайдзіце значэнне выразу $\cos 75^\circ + \qquad ^\circ$.

Рашэнне. Прыменім формулу сумы косінусаў:

$$\cos 75^\circ + \qquad ^\circ \quad 2\cos\frac{75 \quad 15}{2}\cos\frac{75 \quad 15}{2} \quad 2\cos 45 \ \cos 30$$

$$= 2 \cdot \frac{\sqrt{2}}{2} \cdot \frac{\sqrt{3}}{2} = \frac{\sqrt{6}}{2}.$$

2. Дакажыце тоеснасць $\frac{\sin 3 \qquad \sin 5}{\cos 3 \qquad \cos 5} \qquad \operatorname{tg} 4 \quad .$

Рашэнне. Выкарыстаем формулы сумы сінусаў і сумы косінусаў двух вуглоў:

$$\frac{\sin 3 \qquad \sin 5}{\cos 3 \qquad \cos 5} \quad \frac{2\sin\frac{3 \quad 5}{2}\cos\frac{3 \quad 5}{2}}{2\cos\frac{3 \quad 5}{2}\cos\frac{3 \quad 5}{2}} = \frac{2\sin 4 \quad \cos}{2\cos 4 \quad \cos} \quad \frac{\sin 4}{\cos 4} \quad \operatorname{tg} 4 \quad .$$

3. Вылічыце:

а) $\frac{\sin 32 \quad \sin 58}{\sin 13}$; б) $\frac{\cos 74 \quad \cos 14}{\sin 74 \quad \sin 14}$.

Рашэнне. а) $\frac{\sin 32 \quad \sin 58}{\sin 13} \quad \frac{2\sin\frac{32 \quad 58}{2}\cos\frac{32 \quad 58}{2}}{\sin 13} \quad \frac{2\sin \quad 13 \quad \cos 45}{\sin 13}$

$$\frac{2\sin 13 \ \cos 45}{\sin 13} \quad 2\cos 45 \quad 2 \cdot \frac{\sqrt{2}}{2} \quad \sqrt{2};$$

б) $\frac{\cos 74 \quad \cos 14}{\sin 74 \quad \sin 14} \quad \frac{2\sin\frac{74 \quad 14}{2}\sin\frac{74 \quad 14}{2}}{2\sin\frac{74 \quad 14}{2}\cos\frac{74 \quad 14}{2}} = \frac{2\sin 30 \ \sin 44}{2\sin 44 \ \cos 30} \quad \frac{\sin 30}{\cos 30} =$

$$= \quad \operatorname{tg} 30 \qquad \frac{\sqrt{3}}{3}.$$

4. Рашыце ўраўненне:

а) $\sin 3x + \qquad x = \qquad x$; б) $\sqrt{2}\sin 2x + \cos 5x - \cos 9x = 0$.

Рашэнне. а) Запішам ураўненне ў выглядзе $\sin 3x - \quad x + \quad x = 0$ і прыменім формулу рознасці сінусаў:

$(\sin 3x - \quad x) + \quad x = 0;\ 2\sin x \quad x + \quad x = 0;$

$$x\,(2\sin x + 1) = 0; \quad \begin{matrix} \cos 2x \quad 0, \\ 2\sin x \quad 1 \quad 0; \end{matrix} \quad \begin{matrix} \cos 2x \quad 0, \\ \sin x \quad \frac{1}{2}; \end{matrix}$$

$$2x \quad \frac{}{2} \quad k,\ k \quad \boldsymbol{Z}, \qquad x \quad \frac{}{4} \quad \frac{k}{2},\ k \quad \boldsymbol{Z},$$

$$x \quad 1^{n \quad 1} \frac{}{6} \quad n,\ n \quad \boldsymbol{Z}; \qquad x \quad 1^{n \quad 1} \frac{}{6} \quad n,\ n \quad \boldsymbol{Z}.$$

Адказ: $\frac{}{4} \quad \frac{k}{2},\ k \quad \boldsymbol{Z};\quad 1^{n \quad 1} \frac{}{6} \quad n,\ n \quad \boldsymbol{Z}.$

б) Выкарыстаем формулу рознасці косінусаў і атрымаем:

$\sqrt{2}\sin 2x \quad \cos 5x \quad \cos 9x \quad 0;\ \sqrt{2}\sin 2x - 2\sin 7x \sin(-2x) = 0;$

$\sqrt{2}\sin 2x \quad 2\sin 7x \sin 2x \quad 0;\ \sin 2x \ \sqrt{2} \quad 2\sin 7x \quad 0;$

$$\begin{matrix} \sin 2x \quad 0, \\ \sqrt{2} \quad 2\sin 7x \quad 0; \end{matrix} \quad \begin{matrix} \sin 2x \quad 0, \\ \sin 7x \quad \frac{\sqrt{2}}{2}; \end{matrix}$$

$$2x \quad k,\ k \quad \boldsymbol{Z}, \qquad x \quad \frac{k}{2},\ k \quad \boldsymbol{Z},$$

$$7x \quad 1^{n \quad 1} \frac{}{4} \quad n,\ n \quad \boldsymbol{Z}; \qquad x \quad 1^{n \quad 1} \frac{}{28} \quad \frac{n}{7},\ n \quad \boldsymbol{Z}.$$

Адказ: $\frac{k}{2},\ k \quad \boldsymbol{Z};\quad 1^{n \quad 1} \frac{}{28} \quad \frac{n}{7},\ n \quad \boldsymbol{Z}.$

Выберыце роўнасць, правільную для любых вуглоў α і β:

а) $\cos\alpha - \quad \beta = \cos(\alpha - \beta)$; б) $\cos\alpha - \quad \beta = \sin(\alpha - \beta)$;

в) $\cos\alpha - \quad \beta = \quad 2\sin\frac{}{2}\sin\frac{}{2}$; г) $\cos\alpha - \quad \beta = \quad 2\cos\frac{}{2}\cos\frac{}{2}$.

1.521. Пераўтварыце ў здабытак:

а) $\cos 5\alpha + \quad \alpha$; б) $\sin 4\alpha - \sin 10\alpha$;

в) $\cos\alpha - \quad \alpha$; г) $\sin 0{,}5\alpha + \sin 1{,}5\alpha$.

1.522. Вылічыце:

а) $\sin 15^\circ + \sin 105^\circ$; б) $\cos\frac{}{12} \quad \cos\frac{7}{12}$.

1.523. Дакажыце тоеснасць:

а) $\dfrac{\sin \quad \sin 5}{\cos \quad \cos 5} \quad \operatorname{tg} 2 \quad$;   б) $\dfrac{\sin \quad \sin}{\cos \quad \cos} \quad \operatorname{tg} \dfrac{}{2}$.

1.524. Рашыце ўраўненне:

а) $\sin 4x = \sin 10x$;   б) $\cos \ 2x \quad \dfrac{}{4} \quad \cos 4x$;

в) $\sin \dfrac{}{4} \quad x \quad \sin \dfrac{}{12} \quad x \quad 1.$

1.525. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sin 10° + \sin 50° - \cos 20°$;   б) $\cos \dfrac{17}{36} \quad \cos \dfrac{7}{36} \quad \cos \dfrac{5}{36}$;

в) $\dfrac{\sin 35 \quad \sin 85}{\cos 25}$;   г) $\dfrac{\cos 59 \quad \cos 1}{\sin 59 \quad \sin 1}$.

1.526. Спрасціце выраз:

а) $\dfrac{\sin 4}{\sin \quad \sin 3}$;   б) $\dfrac{\sin \quad 2\sin 2 \quad \sin 3}{\cos \quad 2\cos 2 \quad \cos 3}$.

1.527. Дакажыце тоеснасць $\dfrac{\sin \dfrac{}{4} \quad \sin \dfrac{}{4}}{\sin \dfrac{}{4} \quad \sin \dfrac{}{4}} \quad \operatorname{ctg} \quad$.

1.528. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sin 58 \quad \cos 28 \quad \sqrt{3}\cos 2 \quad$;   б) $\dfrac{\sin \dfrac{7}{18} \quad \sin \dfrac{}{9}}{\cos \dfrac{7}{18} \quad \cos \dfrac{}{9}}$;

в) $\dfrac{\sin \dfrac{5}{12} \quad \sin \dfrac{}{12}}{\cos \dfrac{}{6} \cos \dfrac{}{12} \quad \sin \dfrac{}{6} \sin \dfrac{}{12}}$.

1.529. Рашыце ўраўненне:

а) $\cos x - \quad x = \quad x$;   б) $5\sin 2x = \quad x - \quad x$;

в) $\sin x \quad x - \quad x \quad x = \quad x$;   г) $\sin 3x + \quad x = \quad x$.

1.530. Пераўтварыце ў здабытак:

а) $\cos \ \alpha - \quad \alpha + \quad \alpha$;   б) $2\cos \alpha \quad \alpha + \quad \alpha$.

1.531. Вылічыце:

а) $\sin 75° + \cos 75°$;   б) $\sin 15° + \quad °$;   в) $\sin \dfrac{5}{12} \quad \cos \dfrac{5}{12}$.

1.532. Спрасціце выраз $\dfrac{\sin}{\cos 2} \quad \dfrac{\cos}{\sin 2} \quad \dfrac{\sin 7 \quad \sin}{\cos}$.

1.533. Пераўтварыце ў здабытак:

а) $\cos 8\alpha + \quad \alpha$; б) $\sin 2\alpha - \quad \alpha$;
в) $\cos\alpha - \quad \alpha$; г) $\sin\alpha + \sin 10\alpha$.

1.534. Вылічыце:

а) $\sin 105° - \sin 75°$; б) $\sin 75° + \quad °$.

1.535. Дакажыце тоеснасць:

а) $\dfrac{\sin \quad \sin 3}{\cos \quad \cos 3} \quad \operatorname{tg} 2 \quad$; б) $\dfrac{\cos\frac{}{4} \quad \cos\frac{}{4}}{\cos\frac{}{4} \quad \cos\frac{}{4}} \quad \operatorname{ctg} \quad$.

1.536. Рашыце ўраўненне:

а) $\cos 5x = \cos 7x$; б) $\sin\ 6x \quad \frac{}{3} \quad \sin\ 2x \quad \frac{}{4}$;

в) $\cos(40° - x) + \cos(80° + x) = 1$.

1.537. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\cos 85° + \quad ° - \quad °$; б) $\sin\frac{}{18} \quad \sin\frac{5}{18} \quad \cos\frac{}{9}$;

в) $\dfrac{\cos 24 \quad \cos 84}{\sin 54}$; г) $\dfrac{\cos 89 \quad \cos 1}{\sin 89 \quad \sin 1}$.

1.538. Спрасціце выраз:

а) $\dfrac{\sin \quad \sin}{\cos \quad \cos}$; б) $\dfrac{\sin 4}{\cos 3 \quad \cos}$; в) $\dfrac{\sin \quad \sin 3 \quad \sin 5}{\cos \quad \cos 3 \quad \cos 5}$.

1.539. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\cos 80 \quad \cos 40 \quad \cos 20$; б) $\cos 47 \quad \sin 77 \quad \sqrt{3}\cos 17$;

в) $\dfrac{\cos 29 \quad \cos 91}{\sin 31}$; г) $\dfrac{\sin\frac{5}{18} \quad \sin\frac{2}{9}}{\cos\frac{5}{18} \quad \cos\frac{2}{9}}$;

д) $\dfrac{\cos 25\ \cos 15 \quad \sin 25\ \sin 15}{\cos 100 \quad \cos 20}$; е) $\dfrac{\cos\frac{5}{12} \quad \cos\frac{}{12}}{\cos\frac{}{3}\cos\frac{}{12} \quad \sin\frac{}{3}\sin\frac{}{12}}$.

1.540. Рашыце ўраўненне:

а) $\cos x - \cos 7x = \quad x$; б) $7\sin 2x = \sin 7x - \quad x$;
в) $\cos x \quad x + \quad x \quad x = \quad x$; г) $\cos x + \quad x + \quad x = 0$.

1.541. Спрасціце выраз $\dfrac{\sin}{\sin 2} \quad \dfrac{\cos}{\cos 2} \quad \dfrac{\cos \quad \cos 7}{\sin}$.

1.542. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\cos 70° + \sin 140° - \cos 10°$; б) $\dfrac{\sin^2 49 \quad \cos^2 49}{\cos 53 \quad \cos 37}$.

1.543. Знайдзіце значэнне выразу $\sqrt{45} - 11\sqrt{1\frac{1}{4}} + \sqrt{61\frac{1}{4}}$.

1.544. Знайдзіце здабытак каранёў ураўнення $\dfrac{x}{x^2 - 25} + \dfrac{x + 4}{x + 5} = 0$.

1.545. Кошт тавару спачатку павялічылі на 10 %, а затым паменшылі на 25 % у параўнанні з павялічаным коштам. У выніку тавар стаў таннейшым на 7 р. Знайдзіце, колькі каштаваў тавар першапачаткова.

Выніковая самаацэнка

Пасля вывучэння гэтага раздзела я павінен:

- ведаць азначэнні сінуса, косінуса, тангенса, катангенса вугла;
- ведаць уласцівасці трыганаметрычных функцый;
- ведаць формулы трыганаметрыі;
- умець тлумачыць азначэнне і ўласцівасці сінуса, косінуса, тангенса, катангенса з дапамогай трыганаметрычнай акружнасці;
- умець карыстацца формуламі для рашэння найпрасцейшых трыганаметрычных ураўненняў;
- умець карыстацца алгарытмамі рашэння трыганаметрычных ураўненняў асноўных тыпаў;
- умець выконваць пабудову графікаў трыганаметрычных функцый і пераўтвараць графікі трыганаметрычных функцый;
- умець выконваць пераўтварэнні трыганаметрычных выразаў з дапамогай формул прывядзення, складання, сумы і рознасці, двайнога аргумента, аднаго аргумента;
- умець выконваць заданні на прымяненне формул трыганаметрыі для рашэння ўраўненняў, вылічэння значэнняў выразаў;
- умець прымяняць правілы і алгарытмы пераўтварэння трыганаметрычных выразаў для вывучэння ўласцівасцей функцый.

Я правяраю свае веды

1. Пункт P_α адзінкавай акружнасці мае каардынаты $P \quad \frac{1}{3}; \frac{2\sqrt{2}}{3}$. Выберыце правільныя роўнасці:

а) $\sin \quad \frac{1}{3}$; б) $\sin \quad \frac{2\sqrt{2}}{3}$; в) $\cos \quad \frac{1}{3}$; г) $\cos \quad \frac{2\sqrt{2}}{3}$.

2. а) Выразіце ў градусах вугал $\frac{7\pi}{18}$ рад; б) выразіце ў градусах вугал –2,8 рад; в) выразіце ў радыянах вугал –240°.

3. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $8\sin\quad\frac{}{3}\quad\cos\quad\frac{}{6}$;   б) $\text{tg}\frac{}{4}\text{ctg}\frac{}{3}\quad 2\sin^2\quad\frac{}{6}$;

в) $\cos 180\quad \sin 270$.

4. Спрасціце выраз:

а) $\cos\qquad\cos$;   б) $\sin\qquad\cos\quad\frac{}{2}$;

в) $\text{tg}^2\qquad\sin^2\qquad\sin^2\frac{3}{2}$.

5. Знайдзіце значэнне выразу:

а) · ;   б) $\sqrt{3}\sin\frac{4}{3}\quad\text{tg}^2\frac{5}{4}$;

в) $\cos 139\ \cos 19\quad \sin 139\ \sin 19$;   г) $\frac{1\quad \text{tg}12\ \text{tg}48}{\text{tg}12\quad \text{tg}48}$;

д) $2\cos 105°\sin 105°$;   е) $\cos^2 112{,}5\quad \sin^2 112{,}5$.

6. Вядома, што α і β — вуглы трэцяй чвэрці і $\cos\quad\frac{12}{13}$, $\sin\quad\frac{4}{5}$. Знайдзіце $\sin(\alpha-\beta)$.

7. Рашыце ўраўненне:

а) $2\cos^2 x\quad 5\cos x\quad 3\quad 0$;   б) $5\cos^2 x\quad 2\sin^2 x\quad 0{,}5\sin 2x\quad 3$;

в) $\cos 10x = \cos x$;   г) $\sin 9x\cos x\quad \cos 9x\sin x\quad 0{,}5$;

д) $\sqrt{2}\sin x = \sin 2x$;   е) $\sin\quad\frac{}{12}\quad x\quad \sin x\quad 0$;

ж) $\cos\ 2x\quad\frac{}{4}\ \cos x\quad \sin\ 2x\quad\frac{}{4}\ \sin x\quad\frac{\sqrt{2}}{2}$.

8. Спрасціце выраз $\frac{\cos\qquad\cos 2\qquad\cos 4\qquad\cos 5}{\sin\qquad\sin 2\qquad\sin 4\qquad\sin 5}$ і знайдзіце яго значэнне пры $\quad\frac{}{18}$.

9. Пабудуйце графік функцыі $y\quad\sin\ x\quad\frac{}{6}\quad 1$ і запішыце яе ўласцівасці.

10. Знайдзіце абсцысы пунктаў перасячэння прамой $y = -$ і графіка функцыі $y = \quad x + \quad x$.

Дадатковыя матэрыялы да вучэбнага дапаможніка «Алгебра, 10» можна знайсці на сайце http://e-vedy.adu.by, курс «Матэматыка. 10 клас».

Раздзел 2

КОРАНЬ -й СТУПЕНІ З ЛІКУ

§ 13. Корань n-й ступені з ліку a ($n \geqslant 2$, $n \in N$)

2.1. Колькі каранёў мае ўраўненне:
а) $x^2 = 0{,}81$; б) $x^2 = -0{,}01$; в) $x^2 = 0$?

2.2. Знайдзіце значэнне выразу $0{,}02 \cdot \sqrt{90\,000} - \frac{17}{\sqrt{2{,}89}} - 0{,}5 \cdot \sqrt{144}$.

2.3. Выкарыстаўшы ўласцівасці ступені, вылічыце:

а) $3^8 : \; 3^5 \;\; ^2$; б) $\frac{1}{2} \;\; ^9 \;\; 0{,}5 \;\; ^7 \;\; 4 \;\; ^1$; в) $1{,}2^{19} \;\; 1{,}2^{-18} \;\; 12^0$.

Разгледзім некалькі задач. *Задача* 1. Кубічны экалагічны рэзервуар для захоўвання вады мае аб’ём $3\frac{3}{8}$ м . Знайдзіце даўжыню канта куба.

Рашэнне. Абазначым даўжыню канта куба праз x м, тады аб’ём куба роўны x м . Атрымаем ураўненне $x^3 = 3\frac{3}{8}$. Для яго рашэння трэба знайсці такі лік, куб якога роўны $3\frac{3}{8}$. Паколькі $\frac{3}{2} \;\; ^3 \quad \frac{27}{8} \quad 3\frac{3}{8}$, то гэта ўраўненне мае корань $x = \frac{3}{2}$, які задавальняе ўмову задачы.

Адказ: даўжыня канта куба роўна 1,5 м.

Задача 2. Укладчык паклаў m рублёў на банкаўскі рахунак, па якім сума ўкладу павялічваецца штогод на p %. Праз 4 гады сума на рахунку склала k рублёў. Вызначце працэнт p, пад які зроблены ўклад, калі вядомы першапачатковы ўклад m і сума на рахунку k праз 4 гады.

Рашэнне. Грашовы ўклад штогод павялічваецца на p %, г. зн. у $\left(1 + \frac{p}{100}\right)$ раза. Праз 4 гады ён будзе роўны $m\left(1 + \frac{p}{100}\right)^4$. Па ўмове задачы $m \;\; 1 \quad \frac{p}{100} \;\; ^4 \quad k$, адкуль $1 \quad \frac{p}{100} \;\; ^4 \quad \frac{k}{m}$. Для вызначэння p спачатку трэба знайсці такі лік, чацвёртая ступень якога роўна $\frac{k}{m}$.

Многія задачы, як і разгледжаныя вышэй, прыводзяць да неабходнасці здабывання кораня n-й ступені з рэчаіснага ліку.

> **Азначэнне.** Няхай $n \in$, $n > 1$, $a \in$. Коранем n-й ступені з ліку a называецца лік, n-я ступень якога роўна a.

Напрыклад:

- коранем трэцяй ступені з ліку 125 з'яўляецца лік 5, паколькі 5 = 125;
- коранем пятай ступені з ліку −32 з'яўляецца лік −2, паколькі −2)^5 = −32;
- каранямі чацвёртай ступені з ліку 81 з'яўляюцца лікі 3 і −3, паколькі $3^4 = 81$ і $(-3)^4 = 81$.

З азначэння вынікае, што для знаходжання кораня n-й ступені з рэчаіснага ліку a трэба рашыць ураўненне $x^n = a$.

Высветлім, колькі каранёў можа мець гэта ўраўненне ў залежнасці ад n і ад a.

1. Корань цотнай ступені з рэчаіснага ліку

Разгледзім ураўненне $x^{2k} = a$, дзе k — натуральны лік.

а) Калі $a < 0$, то ўраўненне не мае каранёў, паколькі $x^{2k} \quad x^{k} \; ^{2} \geqslant 0$.

Такім чынам, **не існуе кораня цотнай ступені з адмоўнага ліку.**

б) Калі $a = 0$, то ўраўненне $x^{2k} = 0$ мае адзіны корань, роўны нулю.

Значыць, **існуе адзіны корань цотнай ступені з ліку нуль.**

в) Калі $a > 0$, то ўраўненне $x^{2k} = a$ мае два сапраўдныя карані: адзін дадатны, а другі — процілеглы яму — адмоўны.

Разгледзім функцыю $f(x) = x^{2k}$, дзе $k \in N$.

Мы разглядалі прыватны выпадак гэтай функцыі — $y = x^2$.

Уласцівасці і графік функцыі $f(x) = x^{2k}$ аналагічныя ўласцівасцям і графіку функцыі $y = x^2$.

Паколькі функцыя $f(x) = x^{2k}$ нарастае на мностве неадмоўных лікаў і a — значэнне, якое прымае гэта функцыя $a \quad 0; \; \infty$, то ўраўненне $x^{2k} = a$ мае адзіны сапраўдны корань пры любым $a \quad 0; \; \infty$.

Няхай x_1 — дадатны корань ураўнення $x^{2k} = a$ (рыс. 116), значыць, лікавая роўнасць $x_1^{2k} = a$ з'яўляецца правільнай. Паколькі $x_1^{2k} \quad x_1 \; ^{2k}$, то правільнай з'яўляецца і лікавая роўнасць $(-x_1)^{2k} = a$, а значыць, лік $-x_1$ таксама з'яўляецца коранем ураўнення $x^{2k} = a$.



Рыс. 116

Такім чынам, існуюць роўна два карані цотнай ступені з дадатнага ліку. Адзін з каранёў з'яўляецца дадатным лікам, а другі — процілеглым яму лікам.

Азначэнне. Арыфметычным коранем n-й ступені з ліку a называецца неадмоўны лік, n-я ступень якога роўна a.

$$\sqrt[n]{a} = b$$
$$b \geqslant 0,\ b^n = a$$

Напрыклад, 2 — арыфметычны корань чацвёртай ступені з ліку 16, паколькі $>$ $=$

Арыфметычны корань n-й ступені з ліку a абазначаецца $\sqrt[n]{a}$ і чытаецца: «арыфметычны корань n-й ступені з ліку a». Лік n называецца паказчыкам кораня, лік a — падкарэнным выразам.

Можна, выкарыстоўваючы абазначэнні, запісаць $\sqrt[4]{16} = 2$. Чытаецца: «арыфметычны корань чацвёртай ступені з ліку 16 роўны 2». Слова «арыфметычны», як правіла, прапускаюць.

Корань другой ступені з ліку прынята называць квадратным коранем (яго ўласцівасці вывучаліся ў 8-м класе). Паказчык кораня другой ступені не пазначаюць. Напрыклад, корань другой ступені з 13 запісваюць $\sqrt{13}$ і вымаўляюць: «квадратны корань з 13».

Дзеянне знаходжання арыфметычнага кораня n-й ступені з ліку a называецца **здабываннем кораня з ліку.**

Прыклад. Выканайце дзеянне здабывання кораня:

а) шостай ступені з ліку 64;

б) восьмай ступені з ліку 0,00000001.

Рашэнне: а) $\sqrt[6]{64} = 2$;

б) $\sqrt[8]{0{,}00000001} = 0{,}1$.

$$\sqrt[4]{81} = 3;\ \sqrt[8]{256} = 2;$$
$$\sqrt[12]{0} = 0;\ \sqrt[10]{1} = 1;$$
$$\sqrt[6]{\frac{64}{729}} = \frac{2}{3};\ \sqrt[4]{0{,}0625} = 0{,}5$$

Такія лікі, як $\sqrt[4]{17}$, $\sqrt[8]{100}$ і да т. п., з'яўляюцца ірацыянальнымі. З дапамогай дзесятковых набліжэнняў можна знайсці іх значэнні з любой зададзенай ступенню дакладнасці.

2. Корань няцотнай ступені з рэчаіснага ліку

Разгледзім ураўненне $x^{2k\quad 1}\quad a$, дзе k — натуральны лік. Гэта ўраўненне мае адзіны корань.

Разгледзім функцыю $f(x)\quad x^{2k\quad 1}$, дзе $k \in N$. Гэта функцыя з'яўляецца нарастальнай на мностве ўсіх рэчаісных лікаў і прымае ўсе значэнні з прамежку $a\quad \infty;\ \infty$.

Паколькі функцыя $f(x)\quad x^{2k\quad 1}$ нарастае на R і a — значэнне, якое прымае гэта функцыя $a\quad \infty;\ \infty$, то ўраўненне $x^{2k\quad 1}\quad a$ мае адзіны сапраўдны корань пры любым a (рыс. 117).



Рыс. 117

Існуе адзіны сапраўдны корань няцотнай ступені з любога рэчаіснага ліку.

Гэты корань для неадмоўнага ліку a называецца **арыфметычным** і абазначаецца гэтаксама, як корань цотнай ступені.

Напрыклад, $\sqrt[3]{8} = 2$; $\sqrt[5]{243} = 3$.

$$\sqrt[3]{27} = 3;\ \sqrt[5]{32} = 2;$$
$$\sqrt[7]{0} = 0;\ \sqrt[9]{1} = 1;$$
$$\sqrt[3]{\frac{64}{125}} = \frac{4}{5};$$
$$\sqrt[7]{0{,}0000001} = 0{,}1$$

Такія лікі, як $\sqrt[5]{25}$; $\sqrt[7]{19}$ і да т. п., з'яўляюцца ірацыянальнымі лікамі.

Корань трэцяй ступені з ліку называюць кубічным коранем. Напрыклад, $\sqrt[3]{15}$ — кубічны корань з 15.

Корань няцотнай ступені з адмоўнага ліку прынята запісваць у выглядзе $\sqrt[5]{-243}$, не называючы яго арыфметычным коранем (чытаецца: «корань пятай ступені з ліку –243»). А выражаюць яго праз арыфметычны корань з процілеглага яму дадатнага ліку. Напрыклад, $\sqrt[5]{\quad 243}\qquad \sqrt[5]{243}\qquad 3$; $\sqrt[7]{\quad 128}\qquad \sqrt[7]{128}\qquad 2$.

Прыклады асноўных заданняў і іх рашэнні

1. Вызначце, колькі існуе караняў:

а) чацвёртай ступені з ліку 25; б) пятай ступені з ліку 46;
в) восьмай ступені з ліку –256; г) сёмай ступені з ліку –1.

Рашэнне. а) Паколькі 25 — дадатны лік, то існуюць два карані чацвёртай (цотнай) ступені з ліку 25;

б) паколькі існуе толькі адзін корань няцотнай ступені з рэчаіснага ліку, то існуе толькі адзін корань пятай ступені з ліку 46;

в) паколькі лік –256 — адмоўны, то не існуе кораня восьмай ступені з ліку –256, бо не існуе кораня цотнай ступені з адмоўнага ліку;

г) паколькі існуе толькі адзін корань няцотнай ступені з рэчаіснага ліку, то існуе толькі адзін корань сёмай ступені з ліку –1.

2. Назавіце паказчык кораня, падкарэнны выраз, прачытайце дадзены выраз:

а) $\sqrt[3]{2}$; б) $\sqrt[6]{4x^2-1}$; в) $\sqrt[8]{a^4b^3}$.

Рашэнне. а) Паказчык кораня роўны 3, падкарэнны выраз 2, дадзены выраз: «кубічны корань з двух»;

б) паказчык кораня роўны 6, падкарэнны выраз $4x^2-1$, дадзены выраз: «корань шостай ступені з рознасці $4x^2$ і 1»;

в) паказчык кораня роўны 8, падкарэнны выраз a^4b^3, дадзены выраз: «корань восьмай ступені са здабытку ступеней a^4 і b ».

3. Якія з наступных роўнасцей:

а) $\sqrt[4]{81}=3$; б) $\sqrt[3]{125}=5$; в) $\sqrt[3]{\ 125}$ 5; г) $\sqrt[6]{729}=-3$

— з'яўляюцца правільнымі?

Рашэнне. а) $\sqrt[4]{81}=3$, паколькі $3>0$ і $3^4=81$, то па азначэнні арыфметычнага кораня n-й ступені з ліку роўнасць правільная;

б) $\sqrt[3]{125}=5$, паколькі $5>0$ і $5^3=125$, то па азначэнні арыфметычнага кораня n-й ступені з ліку роўнасць правільная;

в) $\sqrt[3]{\ 125}$ 5, паколькі $\sqrt[3]{\ 125}$ $\sqrt[3]{125}$ 5, то роўнасць правільная;

г) $\sqrt[6]{729}=-3$, паколькі па азначэнні арыфметычны корань цотнай ступені з ліку роўны неадмоўнаму ліку, то роўнасць няправільная.

4. Якія з дадзеных выразаў:

а) $\sqrt[10]{10}$; б) $\sqrt[7]{128}$; в) $\sqrt[4]{-81}$; г) $\sqrt[7]{-128}$ — не маюць сэнсу?

Рашэнне. а) Выраз $\sqrt[10]{10}$ ёсць арыфметычны корань дзясятай ступені з дадатнага ліку 10, ён мае сэнс;

б) выраз $\sqrt[7]{128}$ ёсць арыфметычны корань сёмай ступені з дадатнага ліку 128, ён мае сэнс;

в) падкарэнны выраз арыфметычнага кораня чацвёртай ступені роўны адмоўнаму ліку –81, дадзены выраз не мае сэнсу, паколькі не існуе кораня цотнай ступені з адмоўнага ліку;

г) выраз $\sqrt[7]{-128}$ мае сэнс, паколькі існуе корань няцотнай ступені з адмоўнага ліку.

5. Колькі каранёў мае ўраўненне:

а) $x^4 = 6$; б) $x^3 = 6$; в) $x^4 = -6$; г) $x^3 = -6$?

Рашэнне. а) Ураўненне мае два карані $x_1 = \sqrt[4]{6}$ і $x_2 = -\sqrt[4]{6}$;

б) ураўненне мае адзін корань $x = \sqrt[3]{6}$;

в) ураўненне не мае каранёў;

г) ураўненне мае адзін корань $x = -\sqrt[3]{6}$.

6. Рашыце ўраўненне:

а) $x^4 \quad 625 \quad 0$; б) $x^6 \quad 245 \quad 0$;

в) $x^3 \quad 216 \quad 0$; г) $x^3 \quad 27 \quad 0$.

Рашэнне. а) $x^4 \quad 625 \quad 0$; $x^4 \quad 625$; $\begin{array}{ll} x \quad \sqrt[4]{625}, & x \quad 5, \\ x \quad\quad \sqrt[4]{625}; & x \quad\quad 5. \end{array}$

Адказ: –5; 5.

б) $x^6 \quad 245 \quad 0$; $x^6 \quad 245$; $\begin{array}{l} x \quad \sqrt[6]{245}, \\ x \quad\quad \sqrt[6]{245}. \end{array}$

Адказ: $-\sqrt[6]{245}$; $\sqrt[6]{245}$.

в) $x^3 \quad 216 \quad 0$; $x^3 = 216$; $x = \sqrt[3]{216}$; $x = 6$.

Адказ: 6.

г) $x^3 \quad 27 \quad 0$; $x^3 = -27$; $x = \sqrt[3]{-27}$; $x = -\sqrt[3]{27}$; $x = -3$.

Адказ: –3.

? Вызначце, цотным ці няцотным з'яўляецца лік n, калі вядома, што ўраўненне $x^n = a$ мае:

а) два розныя карані; б) толькі адзін корань.

2.4. Выберыце правільныя сцверджанні:

а) лік –5 з'яўляецца коранем трэцяй ступені з ліку –125;
б) лік 0 з'яўляецца коранем пятай ступені з ліку 0;
в) лік –2 з'яўляецца коранем чацвёртай ступені з ліку –16;
г) лік 7 з'яўляецца коранем трэцяй ступені з ліку 343.

2.5. Прачытайце выраз:

а) $\sqrt[5]{8}$; б) $\sqrt[3]{12}$; в) $\sqrt[4]{x^9}$; г) $\sqrt[10]{a-b}$.

Назавіце паказчык кораня, падкарэнны выраз.

2.6. З дапамогай азначэння арыфметычнага кораня n-й ступені дакажыце, што:

а) $\sqrt[6]{64}=2$; б) $\sqrt[3]{125}=5$; в) $\sqrt[4]{0{,}0081}=0{,}3$; г) $\sqrt[5]{\dfrac{32}{243}}=\dfrac{2}{3}$.

2.7. Ці правільная роўнасць:

а) $\sqrt[4]{\quad 81} \qquad 3$; б) $\sqrt[3]{0{,}027}=0{,}3$; в) $\sqrt[8]{1}=1$; г) $\sqrt[7]{\quad \dfrac{1}{128}} \qquad \dfrac{1}{2}$?

Адказ абгрунтуйце.

2.8. Ці мае сэнс выраз:

а) $\sqrt[5]{3}$; б) $\sqrt[4]{3}$; в) $\sqrt[7]{-3}$; г) $\sqrt[6]{-3}$?

2.9. Выберыце ўраўненні, якія маюць два карані:

а) $x^4=81$; б) $x^5=32$; в) $x^6=10$;
г) $x^8=0$; д) $x^{10}=-1$; е) $x^7=-5$.

Знайдзіце карані гэтых ураўненняў.

2.10. Рашыце ўраўненне:

а) $x^8 \quad 12 \quad 0$; б) $x^4 \quad 16 \quad 0$;
в) $x^5 \quad 29 \quad 0$; г) $x^9 \quad 13 \quad 0$.

Карані якіх з дадзеных ураўненняў з'яўляюцца рацыянальнымі лікамі?

2.11. Выканайце дзеянне здабывання кораня:

а) $\sqrt[4]{16}$; б) $\sqrt[4]{\dfrac{1}{81}}$; в) $\sqrt[4]{10\,000}$; г) $\sqrt[4]{\dfrac{1}{625}}$;
д) $\sqrt[6]{64}$; е) $\sqrt[10]{1}$; ж) $\sqrt[5]{32}$; з) $\sqrt[3]{0{,}001}$;
і) $\sqrt[3]{125}$; к) $\sqrt[7]{\dfrac{1}{128}}$; л) $\sqrt[9]{0}$; м) $\sqrt[3]{216}$.

2.12. Знайдзіце значэнне кораня:

а) $\sqrt[4]{\dfrac{16}{625}}$; б) $\sqrt[3]{-\dfrac{8}{27}}$; в) $\sqrt[3]{1\dfrac{91}{125}}$; г) $\sqrt[3]{-3\dfrac{3}{8}}$;

д) $\sqrt[4]{5\frac{1}{16}}$; е) $\sqrt[4]{3\frac{13}{81}}$; ж) $\sqrt[3]{-5\frac{23}{64}}$; з) $\sqrt[5]{-7\frac{19}{32}}$.

2.13. Знайдзіце значэнні выразаў $\sqrt[3]{m}$, $\sqrt[3]{8m}$, $\sqrt[3]{-0{,}008m}$, калі:

а) $m = 1$; б) $m = -1$; в) $m = 125$; г) $m = -1000$.

2.14. Выканайце дзеянні:

а) $\sqrt[4]{81} - 6$; б) $19 - \sqrt[3]{8}$; в) $\sqrt[3]{-\frac{1}{27}} - 1\frac{2}{3}$;

г) $\sqrt[3]{0{,}125} - 3{,}5$; д) $\sqrt[4]{16} - \sqrt[3]{125}$; е) $\sqrt[3]{0{,}008} + \sqrt[5]{32}$;

ж) $\sqrt[3]{\frac{1}{8}} - \sqrt[6]{\frac{1}{64}}$; з) $\sqrt[7]{\frac{1}{128}} - \sqrt[9]{1}$; і) $\sqrt[7]{0} - \sqrt[4]{\frac{1}{81}}$.

2.15. Знайдзіце значэнне выразу $\sqrt[6]{a} + \sqrt[3]{a}$, калі:

а) $a = 1$; б) $a = 0$; в) $a = 64$; г) $a = 0{,}000001$.

2.16. Вылічыце:

а) $\sqrt[5]{100\,000} - \sqrt[4]{0{,}0625}$; б) $-\sqrt[3]{0{,}001} + \sqrt[6]{1}$;

в) $\sqrt[3]{-\frac{1}{27}} - \sqrt[5]{0{,}00001}$; г) $-\sqrt[4]{0{,}0016} \cdot \sqrt[3]{8000}$;

д) $-\sqrt[3]{-343} \cdot \sqrt[5]{-1024}$; е) $6 : \sqrt[3]{-3\frac{3}{8}}$;

ж) $\sqrt[6]{0{,}000064} : \sqrt[3]{-0{,}064}$; з) $\sqrt[5]{-\frac{32}{243}} : \sqrt[3]{0{,}216}$.

2.17. Знайдзіце значэнне выразу $-3\sqrt[6]{m} + 0{,}5\sqrt[5]{n}$ пры:

а) $m = 64$, $n = 243$; б) $m = 0$, $n = -1$; в) $m = 0{,}000001$, $n = 0{,}00032$.

2.18. Вылічыце:

а) $\sqrt[3]{6\cos\frac{\pi}{6}}$; б) $\sqrt[5]{\operatorname{tg}\frac{7\pi}{4}}$.

2.19. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[4]{6}\;\;^{4}$; б) $\sqrt[5]{13}\;\;^{5}$; в) $\left(-\sqrt[8]{6}\right)^{8}$; г) $\left(\sqrt[7]{-2}\right)^{7}$;

д) $2\sqrt[4]{11}\;\;^{4}$; е) $\left(-\sqrt[5]{3}\right)^{5}$; ж) $\frac{1}{2}\sqrt[6]{5}\;\;^{6}$; з) $3\sqrt[4]{0{,}2}\;\;^{4}$.

2.20. Вылічыце:

а) $2\sqrt[4]{0{,}0625} - \sqrt[5]{-243}$; б) $\frac{1}{2}\sqrt[4]{1296} - \sqrt[3]{-0{,}064}$;

в) $10\sqrt[4]{0{,}0081} - 0{,}2\sqrt[3]{-1\frac{61}{64}}$; г) $\sqrt{\frac{1}{9}}\quad 3\sqrt[3]{\;2\frac{10}{27}}\quad \frac{1}{8}\sqrt[4]{256}$;

д) $\sqrt{0{,}64}\quad 8\sqrt[3]{\;15\frac{5}{8}}\quad \frac{2}{3}\sqrt[4]{81}$; е) $\sqrt[5]{\frac{1}{243}}\quad 45\sqrt[3]{\;0{,}001}\quad 5\sqrt[4]{0{,}0016}$.

2.21. Аб’ём шара вылічваецца па формуле $V \quad \frac{4}{3} \quad R^3$ (рыс. 118). Выразіце з гэтай формулы R — радыус шара.



Рыс. 118

2.22. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $0{,}6\sqrt[4]{10\,000} - 3\sqrt[7]{-128} + 4 \cdot \left(-\sqrt[8]{6}\right)^8$;

б) $\left(-2\sqrt[3]{-5}\right)^3 - \sqrt[12]{10^{12}} + \left(\frac{1}{2}\sqrt[3]{8}\right)^3$.

2.23*. Вылічыце:

а) $\sqrt[4]{10 + 3\sqrt[3]{8}}$; б) $\sqrt[10]{0{,}7 + 3\sqrt[5]{0{,}00001}}$; в) $\sqrt[3]{\sqrt[3]{0{,}125} \qquad \sqrt[3]{\frac{27}{512}}}$.

2.24. З дапамогай азначэння арыфметычнага квадратнага кораня n-й ступені выберыце ўсе правільныя роўнасці:

а) $\sqrt[4]{16} = 2$; б) $\sqrt[3]{27} = 3$; в) $\sqrt[5]{0{,}00032} = 0{,}2$;

г) $\sqrt[3]{\frac{8}{125}} = -\frac{2}{5}$; д) $\sqrt[4]{1} = 1$; е) $\sqrt[10]{0} = 0$.

2.25. Выберыце выразы, якія маюць сэнс:

а) $\sqrt[6]{12}$; б) $\sqrt[8]{-1}$; в) $\sqrt[5]{6}$; г) $\sqrt[7]{-11}$; д) $\sqrt[4]{0}$.

2.26. Рашыце ўраўненне:

а) $x^4 = 7$; б) $x^6 = 0$; в) $x^7 \quad 4 \quad 0$; г) $x^{10} \quad 1 \quad 0$.

2.27. Знайдзіце значэнне кораня:

а) $\sqrt[4]{81}$; б) $\sqrt[4]{\frac{1}{16}}$; в) $\sqrt[6]{1\,000\,000}$; г) $\sqrt[5]{32}$;

д) $\sqrt[3]{64}$; е) $\sqrt[3]{-27}$; ж) $\sqrt[5]{-1}$; з) $\sqrt[3]{0{,}008}$;

і) $\sqrt[3]{-0{,}125}$; к) $\sqrt[7]{0}$; л) $\sqrt[5]{-0{,}00001}$; м) $\sqrt[3]{-27\,000}$;

н) $\sqrt[8]{256}$; о) $\sqrt[3]{-0{,}216}$.

2.28. Знайдзіце значэнне выразу $x + \sqrt[3]{x}$, калі:

а) $x = 0$; б) $x = -1$; в) $x = 8$;

г) $x = -27$; д) $x = 0{,}001$; е) $x = \frac{64}{125}$.

2.29. Вылічыце:

а) $\sqrt[3]{\frac{125}{216}}$; б) $\sqrt[4]{7\frac{58}{81}}$; в) $\sqrt[3]{-15\frac{5}{8}}$.

2.30. Знайдзіце значэнні выразаў $\sqrt[3]{a}$, $\sqrt[3]{1000a}$, $\sqrt[3]{-0{,}001a}$, калі:
а) $a = 8$; б) $a = -0{,}125$.

2.31. Выканайце дзеянні:

а) $\sqrt[3]{27} - 2$; б) $10 + \sqrt[4]{16}$; в) $0{,}5 + \sqrt[3]{\frac{1}{8}}$;

г) $\sqrt[3]{-125} + 15$; д) $\sqrt[4]{1} - \sqrt[3]{216}$; е) $\sqrt[3]{0{,}064} - \sqrt[5]{243}$;

ж) $\sqrt[3]{-\frac{1}{125}} - \sqrt[4]{\frac{1}{81}}$; з) $\sqrt[5]{\frac{1}{100\,000}} - \sqrt[7]{0}$; і) $\sqrt[4]{10\,000} : \sqrt[3]{0{,}125}$;

к) $-\sqrt[5]{0{,}00001} : \sqrt[3]{-8}$; л) $\sqrt[4]{\frac{81}{625}} \cdot \sqrt[5]{0{,}00032}$; м) $\sqrt[5]{-7\frac{19}{32}} \cdot \sqrt[3]{27\,000}$.

2.32. Знайдзіце значэнне выразу $2\sqrt[4]{x} - \frac{1}{3}\sqrt[3]{y}$ пры:

а) $x = 16$, $y = 343$; б) $x = 0$, $y = -1$; в) $x = 0{,}0081$, $y = -0{,}125$.

2.33. Вылічыце:

а) $\sqrt[4]{32\sin\frac{\pi}{6}}$; б) $\sqrt[3]{8\cos\pi}$.

2.34. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[6]{7}^{\;6}$; б) $\sqrt[3]{10}^{\;3}$; в) $\left(-\sqrt[4]{5}\right)^4$;

г) $\left(\sqrt[3]{-7}\right)^3$; д) $2\sqrt[6]{3}^{\;6}$; е) $\left(-\frac{1}{3}\sqrt[4]{6}\right)^4$.

2.35. Вылічыце:

а) $\sqrt[3]{-0{,}125} - \frac{1}{8}\sqrt[6]{64}$; б) $\sqrt[5]{32} \quad 0{,}25\sqrt[3]{\quad 0{,}216}$;

в) $-3\sqrt[4]{\frac{1}{81}} + \sqrt[4]{0{,}0625}$; г) $\sqrt[5]{-100\,000} - 4\sqrt[4]{0{,}0256}$.

2.36. Аб'ём куба вылічваецца па формуле $V = a^3$. Выразіце з гэтай формулы a — даўжыню канта куба.

2.37. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $400\sqrt[3]{-0{,}001} - 0{,}5\sqrt[5]{-0{,}00032} - 3 \cdot \left(-2\sqrt[4]{5}\right)^4$;

б) $4 \cdot \sqrt[4]{7\frac{58}{81}} - \left(2\sqrt[5]{-0{,}1}\right)^5 + \left(-\sqrt[7]{-10^7}\right)$.

2.38. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt{3}\;{}^{2}\quad 5\sqrt{2}\;{}^{2}$; б) $\sqrt{16,9}\cdot\sqrt{10}$;

в) $\frac{\sqrt{6}}{\sqrt{54}}$; г) $\sqrt{24}\quad\sqrt{6}+\sqrt{\frac{7}{9}}\quad\sqrt{7}$.

2.39. Знайдзіце значэнне выразу $\sin\frac{3}{2}\quad 4\cos\quad 5\qquad \sin\quad 8\quad .$

2.40. Рашыце няроўнасць $4-x>\frac{1}{x-1}$.

§ 14. Уласцівасці каранёў *n*-й ступені ($n>1$, $n\in N$)

2.41. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt{3}\cdot\sqrt{75}$; б) $\frac{\sqrt{72}}{\sqrt{2}}$; в) $\sqrt{12}-\sqrt{3}$.

2.42. Вылічыце:

а) $\sqrt{(-4)^2}$; б) $\sqrt{173^2-52^2}$.

2.43. Пры якіх значэннях t правільная роўнасць:

а) $\sqrt{t^2}=t$; б) $\sqrt{(t\quad 1)^2}\quad 1\quad t$?

Разгледзім дзве ўласцівасці каранёў *n*-й ступені, аналагічныя ўласцівасцям квадратных каранёў.

Уласцівасць 1. Корань *n*-й ступені **са здабытку** неадмоўных множнікаў **роўны здабытку каранёў** *n*-й ступені з гэтых множнікаў:

$$\sqrt[n]{ab}=\sqrt[n]{a}\cdot\sqrt[n]{b},\ \text{дзе}\ a\quad 0,\ b\quad 0,\ n\in N,\ n\quad 1.$$

Уласцівасць 2. Корань *n*-й ступені **з дзелі роўны дзелі каранёў** *n*-й ступені дзялімага і дзельніка, калі дзялімае — неадмоўны лік, а дзельнік — дадатны лік:

$$\sqrt[n]{\frac{a}{b}}=\frac{\sqrt[n]{a}}{\sqrt[n]{b}},\ \text{дзе}\ a\quad 0,\ b\quad 0,\ n\in N,\ n\quad 1.$$

Дакажам уласцівасць 1 для каранёў *n*-й ступені са здабытку двух множнікаў: $\sqrt[n]{ab}=\sqrt[n]{a}\cdot\sqrt[n]{b}$, дзе $a\quad 0$, $b\quad 0$, $n\in N$, $n\quad 1$.

Доказ. Пры доказе будзем карыстацца азначэннем арыфметычнага кораня *n*-й ступені з ліку і ўласцівасцямі ступені з цэлым паказчыкам.

Абазначым $\sqrt[n]{a}\cdot\sqrt[n]{b}=t$ і пакажам, што $t\geqslant 0$ і $t^n=ab$.

1) Па азначэнні арыфметычнага кораня n-й ступені з ліку маем: $\sqrt[n]{a} \geqslant 0$ і $\sqrt[n]{b} \geqslant 0$, а паколькі здабытак двух неадмоўных множнікаў ёсць неадмоўны лік, то $\sqrt[n]{a} \quad \sqrt[n]{b} \quad 0$, значыць, $t \geqslant 0$.

2) Па ўласцівасці ступені з цэлым паказчыкам атрымаем:

$t^n \quad \sqrt[n]{a} \cdot \sqrt[n]{b} \quad ^n \quad \sqrt[n]{a} \quad ^n \cdot \sqrt[n]{b} \quad ^n$, а па азначэнні кораня n-й ступені з ліку $\sqrt[n]{a} \quad ^n \cdot \sqrt[n]{b} \quad ^n \quad ab$, г. зн. $t^n = ab$. Такім чынам, уласцівасць даказана.

Уласцівасць 2 дакажыце самастойна.

Прыклад 1. Вылічыце:

а) $\sqrt[5]{243 \cdot 32}$; б) $\sqrt[4]{36} \cdot \sqrt[4]{\dfrac{4}{9}}$; в) $\sqrt[3]{36} \cdot \sqrt[3]{48}$.

$$\sqrt[n]{ab} = \sqrt[n]{a} \cdot \sqrt[n]{b}$$

Рашэнне. а) $\sqrt[5]{243 \cdot 32} = \sqrt[5]{243} \cdot \sqrt[5]{32} = 3 \cdot 2 = 6$;

б) $\sqrt[4]{36} \cdot \sqrt[4]{\dfrac{4}{9}} = \sqrt[4]{36 \cdot \dfrac{4}{9}} = \sqrt[4]{16} = 2$;

в) $\sqrt[3]{36} \cdot \sqrt[3]{48} = \sqrt[3]{36 \cdot 48} = \sqrt[3]{216 \cdot 8} = \sqrt[3]{216} \cdot \sqrt[3]{8} = 6 \cdot 2 = 12$.

Прыклад 2. Вылічыце:

$$\sqrt[n]{\frac{a}{b}} = \frac{\sqrt[n]{a}}{\sqrt[n]{b}}$$

а) $\sqrt[4]{\dfrac{81}{256}}$; б) $\dfrac{\sqrt[5]{64}}{\sqrt[5]{2}}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[4]{\dfrac{81}{256}} = \dfrac{\sqrt[4]{81}}{\sqrt[4]{256}} = \dfrac{3}{4}$; б) $\dfrac{\sqrt[5]{64}}{\sqrt[5]{2}} = \sqrt[5]{\dfrac{64}{2}} = \sqrt[5]{32} = 2$.

Уласцівасць 3. Значэнне кораня са ступені не зменіцца, калі і паказчык кораня, і паказчык падкарэннага выразу памножыць на адзін і той жа натуральны лік або падзяліць на іх агульны дзельнік:

$$\sqrt[n]{a^m} = \sqrt[n \cdot k]{a^{m \cdot k}}; \quad \sqrt[n]{a^m} = \sqrt[n : r]{a^{m : r}},$$

дзе $a \geqslant 0$, $n \in \quad$, $m \in \quad$, $k \in \quad$, r — агульны натуральны дзельнік лікаў m і n, $n > 1$, $k > 1$ і $r > 1$.

Дакажам, што $\sqrt[n]{a^m} = \sqrt[nk]{a^{mk}}$ або $\sqrt[nk]{a^{mk}} = \sqrt[n]{a^m}$. Доказ правядзём на падставе азначэння кораня ступені nk з ліку a^{mk}.

Абазначым $\sqrt[n]{a^m} = t$, пакажам, што $t \geqslant 0$ і $t^{nk} = a^{mk}$.

Відавочна, што $t \geqslant 0$ па азначэнні арыфметычнага кораня.

Пакажам, што $t^{nk} \quad \sqrt[n]{a^m} \quad ^{nk} \quad a^{mk}$. Па ўласцівасці ступені з цэлым паказчыкам і азначэнні кораня справядлівыя роўнасці: $\sqrt[n]{a^m} \quad ^{nk} \quad \sqrt[n]{a^m} \quad ^n \quad ^k \quad a^m \quad ^k \quad a^{mk}$.

Прыклад 3. Спрасціце выраз $\sqrt[21]{128}$.

Рашэнне:
$\sqrt[21]{128} = \sqrt[21]{2^7} = \sqrt[3\cdot 7]{2^7} = \sqrt[3]{2}$.

$$\sqrt[n]{a^m} = \sqrt[n\cdot k]{a^{m\cdot k}}$$
$$\sqrt[n]{a^m} = \sqrt[n:r]{a^{m:r}}$$

Уласцівасць 4. Каб здабыць корань k-й ступені з кораня n-й ступені з неадмоўнага ліку, дастаткова здабыць корань ступені nk з гэтага ліку:

$$\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}} = \sqrt[kn]{a}$$

для любых натуральных $n > 1$ і $k > 1$, $a \geqslant 0$.

Для доказу дастаткова паказаць, што $\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}}^{\;nk}$ a.

Па ўласцівасці ступені з натуральным паказчыкам маем: $\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}}^{\;nk}$ $\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}}^{\;k\;\;n}$.

Па азначэнні кораня атрымаем: $\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}}^{\;k\;\;n}$ $\sqrt[n]{a}^{\;n}$ a. Уласцівасць даказана.

Прыклад 4. Спрасціце выраз $\sqrt[3]{\sqrt[4]{15}}$.

Рашэнне:
$\sqrt[3]{\sqrt[4]{15}} = \sqrt[3\cdot 4]{15} = \sqrt[12]{15}$.

$$\sqrt[k]{\sqrt[n]{a}} = \sqrt[kn]{a}$$

Уласцівасць 5. Для любога рэчаіснага a і натуральнага $n > 1$ справядлівая роўнасць $\sqrt{}$ $|\;\;|$

Сапраўды, калі n — цотны лік, то $|a|^n = a^n$. Калі n — няцотны лік, то $a^n = a^n$. Такім чынам, на падставе азначэння кораня n-й ступені ўласцівасць даказана.

Прыклад 5. Вылічыце:

а) $\sqrt[8]{(-3)^8}$; б) $\sqrt[5]{(-3)^5}$.

Рашэнне.

а) $\sqrt[8]{(\;3)^8}$ $|\;3|$ 3; б) $\sqrt[5]{(\;3)^5}$ 3.

$\sqrt{}$ $|\;\;|$

Прыклады асноўных заданняў і іх рашэнні

1. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[4]{81 \cdot 625}$; б) $\sqrt[5]{0{,}00032 \cdot 3125}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[4]{81 \cdot 625} = \sqrt[4]{81} \cdot \sqrt[4]{625} = 3 \cdot 5 = 15$;

б) $\sqrt[5]{0{,}00032 \cdot 3125} = \sqrt[5]{0{,}00032} \cdot \sqrt[5]{3125} = 0{,}2 \cdot 5 = 1$.

2. Вылічыце:

а) $\sqrt[6]{0{,}000243} \cdot \sqrt[6]{19{,}2}$; б) $\sqrt[3]{144} \cdot \sqrt[3]{12}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[6]{0{,}000243} \cdot \sqrt[6]{19{,}2} = \sqrt[6]{0{,}000243 \cdot 19{,}2} =$

$= \sqrt[6]{0{,}000243 \cdot 0{,}3 \cdot 64} = \sqrt[6]{0{,}3^5 \cdot 0{,}3 \cdot 64} = 0{,}3 \cdot 2 = 0{,}6$;

б) $\sqrt[3]{144} \cdot \sqrt[3]{12} = \sqrt[3]{12^2 \cdot 12} = \sqrt[3]{12^3} = 12$.

3. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[4]{\dfrac{0{,}0625}{810\,000}}$; б) $\sqrt[3]{\dfrac{216\,000}{0{,}001}}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[4]{\dfrac{0{,}0625}{810\,000}} = \dfrac{\sqrt[4]{0{,}0625}}{\sqrt[4]{810\,000}} = \dfrac{0{,}5}{30} = \dfrac{1}{60}$;

б) $\sqrt[3]{\dfrac{216\,000}{0{,}001}} = \dfrac{\sqrt[3]{216\,000}}{\sqrt[3]{0{,}001}} = \dfrac{60}{0{,}1} = 600$.

4. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\dfrac{\sqrt[4]{128}}{\sqrt[4]{8}}$; б) $\dfrac{\sqrt[5]{0{,}000064}}{\sqrt[5]{0{,}2}}$.

Рашэнне. а) $\dfrac{\sqrt[4]{128}}{\sqrt[4]{8}} = \sqrt[4]{\dfrac{128}{8}} = \sqrt[4]{16} = 2$;

б) $\dfrac{\sqrt[5]{0{,}000064}}{\sqrt[5]{0{,}2}} = \sqrt[5]{\dfrac{0{,}000064}{0{,}2}} = \sqrt[5]{0{,}00032} = 0{,}2$.

5. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[6]{16}$; б) $\sqrt[4]{25^2}$; в) $\sqrt[3]{4} \cdot \sqrt[6]{2}$; г) $\dfrac{\sqrt[4]{6}}{\sqrt[3]{2}}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[6]{16} = \sqrt[6]{2^4} = \sqrt[3]{2^2} = \sqrt[3]{4}$; б) $\sqrt[4]{25^2} = \sqrt{25} = 5$;

в) $\sqrt[3]{4} \cdot \sqrt[6]{2} = \sqrt[6]{4^2} \cdot \sqrt[6]{2} = \sqrt[6]{2^4 \cdot 2} = \sqrt[6]{2^5} = \sqrt[6]{32}$;

г) $\dfrac{\sqrt[4]{6}}{\sqrt[3]{2}} = \dfrac{\sqrt[12]{6^3}}{\sqrt[12]{2^4}} = \sqrt[12]{\dfrac{2^3 \cdot 3^3}{2^4}} = \sqrt[12]{\dfrac{27}{2}} = \sqrt[12]{13{,}5}.$

6. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[3]{\sqrt[5]{a}}$; б) $\sqrt{\sqrt[8]{a}}$; в) $\sqrt[9]{\sqrt{a^3}}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[3]{\sqrt[5]{a}} = \sqrt[15]{a}$; б) $\sqrt{\sqrt[8]{a}} = \sqrt[2\cdot 8]{a} = \sqrt[16]{a}$;

в) $\sqrt[9]{\sqrt{a^3}} = \sqrt[18]{a^3} = \sqrt[6]{a}$.

7. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[6]{(-5)^6}$; б) $\sqrt[13]{(-7)^{13}}$.

Рашэнне. а) $\sqrt[6]{(\ \ 5)^6}$ $|\ \ 5|$ 5; б) $\sqrt[13]{(\ \ 7)^{13}}$ 7.

8. Замяніце выраз на тоесна роўны яму:

а) $\sqrt{k\quad}$ $k \geqslant$ б) $\sqrt{p\quad}$ $p \leqslant$

Рашэнне. а) $\sqrt{k\quad} = |k| = k$ $k \geqslant$

б) $\sqrt{p\quad} = |p| = -p$ $p \leqslant$

1. Пры якіх значэннях a і b правільная роўнасць $\sqrt[6]{\dfrac{a}{b}} = \dfrac{\sqrt[6]{a}}{\sqrt[6]{b}}$?

2. Пры якіх значэннях m правільная роўнасць $\sqrt[8]{m^8} = -m$?

2.44. Вылічыце з дапамогай уласцівасці кораня n-й ступені са здабытку:

а) $\sqrt[3]{8 \cdot 27}$; б) $\sqrt[3]{64 \cdot 125}$; в) $\sqrt[4]{0{,}0625 \cdot 81}$;

г) $\sqrt[5]{32 \cdot 0{,}00243}$; д) $\sqrt[3]{0{,}027 \cdot 15^3}$; е) $\sqrt[4]{625 \cdot 3^8}$;

ж) $\sqrt[3]{0{,}001 \cdot 64 \cdot 343}$; з) $\sqrt[4]{0{,}0016 \cdot 625 \cdot 7^4}$.

2.45. Знайдзіце значэнне здабытку:

а) $\sqrt[3]{25} \cdot \sqrt[3]{5}$; б) $\sqrt[3]{2} \cdot \sqrt[3]{500}$; в) $\sqrt[5]{2} \cdot \sqrt[5]{16}$;

г) $\sqrt[3]{2{,}7} \cdot \sqrt[3]{10}$; д) $\sqrt[5]{0{,}32} \cdot \sqrt[5]{100}$; е) $\sqrt[4]{0{,}8} \cdot \sqrt[4]{20}$;

ж) $\sqrt[3]{0{,}1} \cdot \sqrt[3]{0{,}08}$; з) $\sqrt[3]{4} \cdot \sqrt[3]{8} \cdot \sqrt[3]{-2}$.

2.46. Знайдзіце значэнне выразу з дапамогай уласцівасці кораня n-й ступені з дзелі:

а) $\sqrt[4]{\frac{81}{0{,}0625}}$; б) $\sqrt[3]{\frac{0{,}064}{1000}}$; в) $\sqrt[5]{\frac{3\,200\,000}{0{,}00243}}$; г) $\sqrt[3]{\frac{0{,}343}{125}}$.

2.47. Знайдзіце значэнне дзелі:

а) $\frac{\sqrt[5]{96}}{\sqrt[5]{3}}$; б) $\frac{\sqrt[3]{2}}{\sqrt[3]{54}}$; в) $\frac{\sqrt[3]{400}}{\sqrt[3]{50}}$;

г) $\frac{\sqrt[4]{4{,}8}}{\sqrt[4]{0{,}3}}$; д) $\sqrt[3]{\frac{5}{36}} : \sqrt[3]{\frac{6}{25}}$; е) $\sqrt[3]{7\frac{1}{5}} : \sqrt[3]{-\frac{1}{30}}$.

2.48. Параўнайце значэнні выразаў $\sqrt[4]{ab}$ і $\sqrt[4]{\frac{a}{b}}$, калі:

а) $a = 16$, $b = 625$; б) $a = -256$, $b = -0{,}0081$; в) $a = 7^4$, $b = 3^8$.

Ці можна знайсці значэнні дадзеных выразаў, калі лікі a і b розных знакаў?

2.49. Вылічыце:

а) $\sqrt[3]{27 \cdot 125} - \sqrt[4]{16 \cdot 81}$; б) $\sqrt[3]{-\frac{8}{343}} + \sqrt[4]{\frac{0{,}0625}{256}}$.

2.50. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[4]{\frac{0{,}0016 \cdot 256}{810\,000}}$; б) $\sqrt[3]{\frac{0{,}008}{27 \cdot 0{,}125}}$.

2.51. Знайдзіце значэнне здабытку:

а) $\sqrt[3]{12} \cdot \sqrt[3]{18}$; б) $\sqrt[4]{72} \cdot \sqrt[4]{18}$; в) $\sqrt[3]{75} \cdot \sqrt[3]{45}$;

г) $\sqrt[5]{160} \cdot \sqrt[5]{625}$; д) $\sqrt[3]{4} \cdot \sqrt[3]{-6} \cdot \sqrt[3]{9}$; е) $\sqrt[4]{4} \cdot \sqrt[4]{27} \cdot \sqrt[4]{12}$.

2.52. Знайдзіце значэнне дзелі:

а) $\frac{\sqrt[3]{16}}{\sqrt[3]{250}}$; б) $\frac{\sqrt[4]{486}}{\sqrt[4]{96}}$; в) $\frac{\sqrt[3]{3125}}{\sqrt[3]{5400}}$; г) $\frac{\sqrt[5]{6{,}4}}{\sqrt[5]{48{,}6}}$.

2.53. Знайдзіце значэнне выразу $\sqrt[4]{2} \cdot \sqrt[4]{8} + \frac{\sqrt[3]{3}}{\sqrt[3]{81}}$, выкарыстаўшы ўласцівасці кораня.

2.54. Знайдзіце, у колькі разоў лік:

а) $\sqrt[6]{128}$ большы за лік $\sqrt[6]{2}$; б) лік $\sqrt[3]{4}$ меншы за лік $\sqrt[3]{108}$.

2.55. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $5\sqrt[3]{3} \cdot \sqrt[3]{9}$; б) $-6\sqrt[5]{4} \cdot 3\sqrt[5]{8}$;

в) $3\sqrt[3]{7} \cdot \left(\sqrt[3]{-49}\right)$; г) $5\sqrt[4]{10} \cdot 0{,}3\sqrt[4]{1000}$.

2.56. Вызначце, ці з'яўляюцца ўзаемна адваротнымі лікі:

а) $\sqrt[3]{5}$ і $\frac{\sqrt[3]{25}}{5}$; б) $2\sqrt[4]{2}$ і $\frac{1}{\sqrt[4]{32}}$; в) $\sqrt[5]{64}$ і $-\frac{1}{\sqrt[5]{64}}$.

2.57. Знайдзіце значэнне выразу на падставе ўласцівасцей кораня n-й ступені:

а) $\sqrt[4]{1780^2 - 780^2}$; б) $\sqrt[3]{0{,}69^2 - 0{,}51^2}$;

в) $\sqrt[4]{\sqrt{34} - 3\sqrt{2}} \cdot \sqrt[4]{\sqrt{34} + 3\sqrt{2}}$; г) $\sqrt[3]{5\sqrt{3} \quad \sqrt{11}} \cdot \sqrt[3]{5\sqrt{3} \quad \sqrt{11}}$.

2.58. Запішыце выраз $\sqrt[3]{2}$ у выглядзе кораня:

а) шостай ступені; б) дзявятай ступені;

в) дванаццатай ступені; г) васямнаццатай ступені.

2.59. Запішыце выраз $\sqrt{a}$ у выглядзе кораня:

а) чацвёртай ступені; б) шостай ступені;

в) дзясятай ступені; г) шаснаццатай ступені.

2.60. Запішыце ў выглядзе каранёў адной і той жа ступені лікі:

а) $\sqrt[3]{2}$, $\sqrt{5}$ і $\sqrt[6]{3}$; б) $\sqrt[4]{2}$, $\sqrt[8]{3}$ і $\sqrt[12]{7}$.

2.61. Запішыце выраз у выглядзе кораня з меншым паказчыкам:

а) $\sqrt[6]{2^4}$; б) $\sqrt[15]{7^9}$; в) $\sqrt[8]{3^4}$; г) $\sqrt[24]{12^8}$;

д) $\sqrt[4]{25}$; е) $\sqrt[6]{81}$; ж) $\sqrt[6]{125}$; з) $\sqrt[12]{27}$.

2.62. Вылічыце:

а) $\sqrt[6]{49^3}$; б) $\sqrt[6]{125^2}$; в) $\sqrt[100]{9^{50}}$; г) $\sqrt[24]{7^{48}}$.

2.63. Запішыце ў выглядзе кораня:

а) $\sqrt[4]{2} \cdot \sqrt[8]{0{,}5}$; б) $\sqrt[6]{3} \cdot \sqrt[3]{\frac{1}{6}}$; в) $\frac{\sqrt[4]{50}}{\sqrt{5}}$;

г) $\frac{\sqrt[10]{80}}{\sqrt[5]{4}}$; д) $\sqrt[8]{2} \cdot \sqrt[12]{3}$; е) $\sqrt[6]{5} : \sqrt[4]{2}$.

2.64. Вызначце, рацыянальным ці ірацыянальным лікам з'яўляецца значэнне выразу:

а) $\sqrt[3]{4} \cdot \sqrt[6]{4}$; б) $\sqrt[7]{-5} \cdot \sqrt[14]{25}$; в) $\sqrt[3]{2} \cdot \sqrt[6]{2} \cdot \sqrt[6]{8}$;

г) $\sqrt{3} \cdot \sqrt[6]{3} \cdot \sqrt[12]{3}$; д) $\frac{\sqrt[3]{7} \cdot \sqrt[4]{343}}{\sqrt[12]{7}}$; е) $\frac{\sqrt[8]{8^3} \cdot \sqrt[40]{8}}{\sqrt[5]{8^4}}$.

2.65. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[3]{\sqrt[3]{a}}$; б) $\sqrt[4]{\sqrt{a}}$; в) $\sqrt{\sqrt[5]{a^2}}$;

г) $\sqrt[5]{\sqrt[6]{a^{10}}}$; д) $\sqrt[3]{\sqrt[4]{a} \cdot \sqrt{a}}$; е) $\sqrt[4]{\sqrt{a}} \cdot \sqrt[6]{\sqrt[4]{a}}$.

2.66 Вылічыце:

а) $\sqrt[3]{\sqrt[3]{9}} \cdot \sqrt[9]{3^7}$; б) $\sqrt[4]{\sqrt[3]{25}} \cdot \sqrt[6]{5^5}$; в) $\dfrac{\sqrt{\sqrt[3]{4}}}{\sqrt[3]{2}} + \dfrac{\sqrt[15]{2}}{\sqrt[5]{\sqrt[3]{2}}}$.

2.67. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[4]{(-17)^4}$; б) $\sqrt[5]{(-10)^5}$; в) $\sqrt[6]{(-7)^6}$; г) $\sqrt[7]{(-13)^7}$.

2.68. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[4]{a^4}$, калі $a \geqslant 0$; б) $\sqrt[6]{b^6}$, калі $b < 0$;

в) $\sqrt[4]{81m^4}$, калі $m \geqslant 0$; г) $\sqrt[8]{\dfrac{c^8}{256}}$, калі $c < 0$;

д) $-3\sqrt[4]{16b^4}$, калі $b < 0$; е) $-2a\sqrt[4]{\dfrac{a^4}{625}}$, калі $a \geqslant 0$.

2.69. Запішыце выраз у выглядзе адначлена:

а) $\sqrt[7]{a^7}$; б) $-4\sqrt[3]{8a^3}$; в) $12a\sqrt[9]{-a^9}$; г) $5a^2\sqrt[5]{-32a^5}$.

2.70. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[4]{x^4} - x$, калі $x \geqslant 0$; б) $\sqrt[6]{x^6} - \sqrt[3]{x^3}$, калі $x \leqslant 0$.

2.71. Спрасціце выраз $\sqrt[3]{343x^3}$ $\sqrt[4]{81x^4}$ $\sqrt{64x^2}$ і знайдзіце яго значэнне пры $x = -0{,}5$.

2.72. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[4]{a^{12}}$, калі $a \geqslant 0$; б) $\sqrt[3]{8b^9}$; в) $\sqrt[4]{16m^8}$; г) $\sqrt[4]{\dfrac{c^{16}}{81}}$;

д) $-6\sqrt[4]{625b^{20}}$, калі $b < 0$; е) $-8a\sqrt[6]{\dfrac{a^{18}}{64}}$, калі $a \geqslant 0$.

2.73. Спрасціце выраз $\sqrt[4]{\dfrac{1}{81}a^4b^{12}}$, калі a і b:

а) лікі аднаго знака; б) лікі розных знакаў.

2.74. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[4]{(a-7)^4}$ пры $a \geqslant 7$; б) $\sqrt[6]{(a+8)^6}$ пры $a < -8$;

в) $\sqrt[8]{(y-3)^8} + \sqrt[4]{(y-5)^4}$ пры $3 \leqslant y \leqslant 5$.

2.75*. Вылічыце:

а) $\sqrt[4]{\left(\sqrt{120} - 11\right)^4} + \sqrt[4]{\left(\sqrt{120} + 11\right)^4}$;

б) $\sqrt[6]{\left(4\sqrt{6} + 10\right)^6} - \sqrt[6]{\left(4\sqrt{6} - 10\right)^6} - 20$.

2.76. Вылічыце з дапамогай уласцівасці кораня n-й ступені са здабытку:

а) $\sqrt[3]{27 \cdot 125}$; б) $\sqrt[4]{81 \cdot 256}$; в) $\sqrt[5]{243 \cdot 0{,}00001}$;

г) $\sqrt[3]{0{,}064 \cdot 343}$; д) $\sqrt[5]{32 \cdot 6^5}$; е) $\sqrt[3]{0{,}008 \cdot 27 \cdot 9^6}$.

2.77. Знайдзіце значэнне здабытку:

а) $\sqrt[3]{4} \cdot \sqrt[3]{2}$; б) $\sqrt[3]{3{,}2} \cdot \sqrt[3]{20}$; в) $\sqrt[4]{6{,}25} \cdot \sqrt[4]{100}$;

г) $\sqrt[5]{24{,}3} \cdot \sqrt[5]{10}$; д) $\sqrt[4]{0{,}5} \cdot \sqrt[4]{0{,}125}$; е) $\sqrt[5]{3} \cdot \sqrt[5]{9} \cdot \sqrt[5]{-9}$.

2.78. Знайдзіце значэнне выразу з дапамогай уласцівасці кораня n-й ступені з дзелі:

а) $\sqrt[4]{\dfrac{16}{0{,}0081}}$; б) $\sqrt[3]{\dfrac{27\,000}{0{,}008}}$; в) $\sqrt[5]{\dfrac{0{,}00001}{32}}$; г) $\sqrt[4]{\dfrac{625}{0{,}0016}}$.

2.79. Знайдзіце значэнне дзелі:

а) $\dfrac{\sqrt[3]{16}}{\sqrt[3]{2}}$; б) $\dfrac{\sqrt[7]{2}}{\sqrt[7]{256}}$; в) $\dfrac{\sqrt[4]{1250}}{\sqrt[4]{2}}$; г) $\dfrac{\sqrt[3]{-128}}{\sqrt[3]{2000}}$.

2.80. Знайдзіце значэнні выразаў $\sqrt{mn}$ і $\sqrt[3]{\dfrac{m}{n}}$, калі:

а) $m = 125$, $n = 0{,}027$; б) $m = 10^6$, $n = 2^3$.

2.81. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[3]{\dfrac{125 \cdot 343}{0{,}027}}$; б) $\sqrt[4]{\dfrac{160\,000}{81 \cdot 625}}$.

2.82. Знайдзіце значэнне выразу, выкарыстаўшы ўласцівасці кораня n-й ступені:

а) $\sqrt[3]{24} \cdot \sqrt[3]{9}$; б) $\sqrt[4]{48} \cdot \sqrt[4]{27}$; в) $\sqrt[3]{-15} \cdot \sqrt[3]{225}$;

г) $\sqrt[5]{48} \cdot \sqrt[5]{162}$; д) $\dfrac{\sqrt[3]{625}}{\sqrt[3]{40}}$; е) $\dfrac{\sqrt[4]{648}}{\sqrt[4]{128}}$.

2.83. Вылічыце:

а) $7\sqrt[3]{2} \cdot \sqrt[3]{4}$; б) $-2\sqrt[5]{9} \cdot 5\sqrt[5]{27}$;

в) $8\sqrt[3]{10} \cdot \left(\sqrt[3]{-100}\right)$; г) $0{,}4\sqrt[4]{5} \cdot 7\sqrt[4]{125}$.

2.84. Знайдзіце значэнне выразу на падставе ўласцівасцей кораня n-й ступені:

а) $\sqrt[4]{175^2 - 168^2}$; б) $\sqrt[3]{7 - \sqrt{22}} \cdot \sqrt[3]{7 + \sqrt{22}}$.

2.85. Запішыце выраз $\sqrt[4]{3}$ у выглядзе кораня:

а) восьмай ступені;
б) дванаццатай ступені;
в) шаснаццатай ступені.

2.86. Запішыце ў выглядзе каранёў адной і той жа ступені лікі:

а) $\sqrt[5]{7}$, $\sqrt{2}$ і $\sqrt[10]{3}$; б) $\sqrt[4]{3}$, $\sqrt[6]{5}$ і $\sqrt[8]{7}$.

2.87. Запішыце выраз у выглядзе кораня з меншым паказчыкам:

а) $\sqrt[12]{3^3}$; б) $\sqrt[8]{5^6}$; в) $\sqrt[4]{7^2}$; г) $\sqrt[12]{3^6}$; д) $\sqrt[6]{27}$; е) $\sqrt[15]{32}$.

2.88. Вылічыце:

а) $\sqrt[8]{25^4}$; б) $\sqrt[12]{27^4}$; в) $\sqrt[30]{81^{15}}$; г) $\sqrt[16]{10^{32}}$.

2.89. Вызначце, рацыянальным ці ірацыянальным лікам з'яўляецца значэнне выразу:

а) $\sqrt[3]{36}\cdot\sqrt[6]{36}$; б) $\sqrt[5]{16}\cdot\sqrt[10]{4}$; в) $\sqrt[3]{5}\cdot\sqrt[6]{5}\cdot\sqrt[12]{5}$; г) $\dfrac{\sqrt{3}\cdot\sqrt[3]{9}}{\sqrt[6]{3}}$.

2.90. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[4]{\sqrt[4]{b}}$; б) $\sqrt[3]{\sqrt{b}}$; в) $\sqrt{\sqrt[7]{b^2}}$; г) $\sqrt[3]{\sqrt[4]{b^6}}$.

2.91. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[3]{\sqrt[3]{16}}\cdot\sqrt[9]{2^5}$; б) $\sqrt[3]{\sqrt[4]{9}}\cdot\sqrt[6]{3^5}$; в) $\dfrac{\sqrt[21]{5}}{\sqrt[7]{\sqrt[3]{5}}}+\dfrac{\sqrt{\sqrt[3]{81}}}{\sqrt[3]{9}}$.

2.92. Знайдзіце значэнне выразу:

а) $\sqrt[8]{(-19)^8}$; б) $\sqrt[3]{(-5)^3}$; в) $\sqrt[4]{(-2)^4}$; г) $\sqrt[5]{(-11)^5}$.

2.93. Спрасціце выраз:

а) $\sqrt[8]{m^8}$, калі $m \geqslant 0$; б) $\sqrt[4]{c^4}$, калі $c < 0$;

в) $\sqrt[6]{64x^6}$, калі $x \geqslant 0$; г) $\sqrt[4]{\dfrac{a^4}{81}}$, калі $a < 0$;

